Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
18 СТУДЗЕНЯ 2017 г. СЕРАДА № 11 (28375)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Што чакае вышэйшую школу?
СТАР. 3




«Мясцовае самакіраванне». Спецвыпуск
СТАР. 5-12



Мюзікл-рэкардсмен у беларускім пракаце
СТАР. 13

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый СЯНЬКО, старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь:**

*«Мытныя органы нашай краіны першымі ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза рэалізуюць пілотныя праекты па аўтаматычным выпуску экспарту, імпарту і транзіту. Укараненне названых праектаў дазваляе значна скараціць часавыя і фінансавыя затраты суб'ектаў гаспадарання. Так, па выніках 2016 года 70% партый тавараў у працэдуры мытнага транзіту афармлена беларускімі мытнікамі на працягу не больш як 10 хвілін».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.01.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9506 | ▼ |
| Еўра | 2,0764 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0328 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0706 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X
17011

# РАСЦЕ ПАМОЧНІК



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Васьмігадовы жыхар Давыд-Гарадка Дзяніс ШАСЦЮК пасля завірухі чысціць снег на сваёй вуліцы.

■ Каляднае

## КУРЫ ПРЫНЕСЛІ Ў ВІРКАЎ ШЧАСЦЕ

**Карэспандэнт «Звязды» наведала ў год Пеўня самае сімвалічнае для гэтай птушкі свята**



Кураняты — чаканыя госці ў любым доме.

**Абрад «Куры» — своеасаблівая візітоўка вёскі Віркаў Клічаўскага раёна. У яго свае традыцыі. Ніякіх коз і мядзведзяў, выключна нашчадкі таго самага пеўня, пад знакам якога, згодна з кітайскім календаром, нам жыць цэлы год. Таму і ўдзельнікі абраду — дзятва ад 6 да 14 гадоў. Вясёлай птушынай сямейкай лётаюць яны па дварах, співаюць віншавальныя песні. Так тут калядавалі спакон веку, а 4 гады таму абрад быў прызнаны нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасцю Беларусі. Напярэдадні кожнага Старога Новага года маленькая вёска Віркаў зноў жыве ў прадчуванні цуда. Жыхары пякуць бліны і рыхтуюць розныя прысмакі. Трэба ж не пакрыўдзіць куранят.**

СТАР. 13

■ Разумныя грошы

## УЛАСНЫ «ПЛАСТЫК» З ХІТРЫКАМІ

З дапамогай лімітаў на плацежнай картцы яе ўладальнікі могуць максімальна гарантаваць бяспеку сваіх грошай

**Эксперты банкаўскай сферы адзначаюць, што менавіта ліміты з'яўляюцца адным з найбольш эфектыўных інструментаў барацьбы з картказым махлярствам. Сёння мы сумесна са спецыялістамі плацежнай сістэмы БЕЛКАРТ паспрабуем папулярна расказаць усё пра сутнасць дадзенай паслугі, карысць, якую прыносіць правільнае кіраванне лімітамі, і пра розныя нюансы, уласцівыя гэтаму інструменту.**

### Ліміты бываюць розныя

Паняцце «ліміт» паходзіць ад лацінскага слова «limes» і азначае «лімітавая норма, абмежаванне, мяжа, рубеж, дазволеная колькасць чаго-небудзь». У дачыненні да банкаўскіх плацежных картак ліміт уяўляе сабой тое ці іншае абмежаванне па аперацыях.

Ліміты могуць рабіцца па колькасці і аб'ёме аперацый, а таксама па іх тыпе — напрыклад, можна дазваляць па картцы дзве аперацыі на тыдзень па зняцці наяўных банкнот агульнай сумай да 100 рублёў і 20 (30 ці 40) безнаяўных аперацый сумай да тысячы. Такія ліміты будуць актуальнымі для актыўных карыстальнікаў сучасным кашальком.

Можна вызначаць ліміты па аперацыях за мяжой або ў сетцы інтэрнэт, а можна і зусім забараніць такія трансакцыі — з дапамогай усё тых жа абмежаванняў. У некаторых банках ёсць магчымасць рабіць ліміты не толькі па міжнародных аперацыях у цэлым, але і ў рамках асобных краін. Напрыклад, калі вы збіраецеся наведаць Польшчу, можна адкрыць магчымасць правядзення аперацый на тэрыторыі толькі гэтай краіны. А значыць, ні ў Румыніі, ні ў Тайландзе, ні ў Венесуэле ніхто не зможа зняць грошы з вашай карткі ў выпадку, калі інфармацыя па ёй была скрадзена зламыснікамі.

СТАР. 4

# АФРЫКАНСКІЯ ДАЛЯГЛЯДЫ

## Супрацоўніцтва з краінамі гэтага кантынента — работа на найбліжэйшую перспектыву

**Учарашні дзень у рабочым графіку Прэзідэнта Аляксандра ЛУКАШЭНКІ прайшоў пад знакам афіцыйнага візіту кіраўніка дзяржавы ў Судан, падчас якога былі праведзены стратэгічна важныя для актывізацыі супрацоўніцтва дзвюх краін перагаворы.**

Судан стаў для Беларусі адным з найважнейшых партнёраў на Афрыканскім кантыненце, заявіў Аляксандр Лукашэнка на перагаворах у пашыраным складзе з Прэзідэнтам Судана Амарам Хасанам Ахмедам аль-Башырам, адзначыўшы, што мэта яго цяперашняга візіту — замацаванне дасягнутых вынікаў і вызначэнне новых перспектыўных кірункаў сумеснай дзейнасці.

Па выніках афіцыйных перагавораў Беларусь і Судан заключылі дагавор аб дружалюбных адносінах і супрацоўніцтве, подпісы пад якім паставілі лідары дзвюх краін. Кіраўнікі дзяржаў таксама падпісалі сумесную заяву. Абодва лідары пацвердзілі ўзаемнае імкненне да далейшага развіцця і паглыблення дружалюбных сувязяў паміж дзвюма краінамі ў розных сферах.

Выказана таксама зацікаўленасць у развіцці ўзаемавыгадных адносін паміж галіновымі міністэрствамі, у актывізацыі прамых кантактаў на ўзроўні сярэдняга і малога бізнесу, стварэнні сумесных прадпрыемстваў у галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі, здабычы карысных выкапняў, харчавання і фармацэўтыкі.

Акрамя таго, у прысутнасці прэзідэнтаў падпісаныя міжурадавыя і міжведамасныя дакументы, накіраваныя на пашырэнне супрацоўніцтва ў розных сферах.

Краіны таксама выпрацуюць дарожную карту развіцця супрацоўніцтва з акцэнтам на практычных выніках. «Нам трэба стратэгічнае супрацоўніцтва зазямліць. Таму што ўсё гэта застанецца толькі размовамі, калі мы не падмацуем яго гандлёва-эканамічнымі праектамі. Павінен быць канкрэтны вынік», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы не проста будзем ствараць сумесныя прадпрыемствы, пастаўляць сюды нашу тэхніку і іншыя тавары. Мы павінны навучыць гэта рабіць суданцаў, яны павінны ўмець не проста працаваць на нашай тэхніцы, а глыбока разбірацца ў ёй», — дадаў беларускі лідар. Ён адзначыў, што без будаўніцтва ў Судане не можа быць развіцця. У сувязі з гэтым Прэзідэнт прапанаваў, каб, як і ў Венесуэле, з удзелам беларускіх спецыялістаў у гэтай краіне будаваліся цагельныя заводы, цэментныя вытворчасці, пастаўлялася тэхніка.

Беларусь гатова падключыцца і да праграм па развіцці галін, якія рэалізуюцца ў Судане. Наша краіна можа таксама стаць стратэгічным партнёрам па пашырэнні інтарэсаў суданскіх таваравытворцаў на вялікай тэрыторыі Еўропы і Азіі. На перагаворах падкрэслена важнасць паглыблення кантактаў у гуманітарнай сферы, уключаючы адукацыю, ахову здароўя, навуку. Абмяркоўваліся пытанні супрацоўніцтва на міжнароднай арэне.

У Хартуме Прэзідэнт Беларусі таксама сустрэўся з віцэ-прэзідэнтам Судана Хасабу Абдэльрахманам і старшынёй Нацыянальнай асамблеі Ібрагімам Амерам.

Аляксандр Лукашэнка выступіў перад дэпутатамі абедзвюх палат парламента Судана, дзе падрабязна расказаў аб перавагах супрацоўніцтва з Беларуссю, адкрыта падзяліўся сваім меркаваннем па актуальных пытаннях беларуска-суданскіх адносін.

«Наступае перыяд, калі мы можам вельмі шырока супрацоўнічаць. І трэба выкарыстоўваць гэты момант. Я Прэзідэнту сёння сказаў, што хто раней у Афрыцы пачне ўздым, той выйграе», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. «Афрыка — гэта будучыня ўсёй планеты. Сёння і заўтра за кошт Афрыкі будзе развівацца ўвесь свет», — упэўнены Прэзідэнт Беларусі.

Учора афіцыйны візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Судан завяршыўся.

**Паводле БЕЛТА.**




# Нашымі беспілотнікамі цікавяцца ў Эквадоры

**19 студзеня ў Беларусі адзначаецца Дзень ратавальніка. Напярэдадні прафесійнага свята міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ВАШЧАНКА падвёў вынікі работы ведамства.**


Фота БЕЛТА.

**Міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ВАШЧАНКА і міністр-каардынатар па пытаннях бяспекі Эквадора Сэсар НАВАС ВЕРА ў час падпісання мемарандума.**

Ад 2015 года ў краіне развіваецца сетка грамадскіх цэнтраў бяспекі жыццядзейнасці. Першы такі цэнтр быў створаны на базе спецыялізаванага ліцэя пры Універсітэце грамадзянскай абароны МНС, што месціцца пад Гомелем.

— З улікам яго напрацовак пастаўлена задача мець такія цэнтры ў кожнай вобласці, — зазначыў Уладзімір Вашчанка. — Сёлета такую ўстанову плануецца адкрыць у Лідзе, аналагічныя цэнтры абсталёўваюцца ў Магілёве і Віцебску, Брэсце. Крыху стрымліваецца будаўніцтва ў Мінску. Мы выкарыстоўваем усю матэрыяльную базу, каб людзі, якія жадаюць навучыцца аказваць першую дапамогу, атрымалі гэтую магчымасць. Напрыклад, калі чалавек пажадаў займацца спортам, яму ёсць куды пайсці. А вось з месцамі, дзе можна атрымаць веды па бяспецы, цяжэй. Мы прыходзім у калектывы, усё добра расказваем у тэорыі, але практычны складнік не заўсёды магчыма задзейнічаць. Мы спрабуем данесці людзям, да чаго прыводзіць бесклапотнасць. Бо гэта адна з асноўных прычын усіх бед і непрыемнасцяў.

Летась у красавіку Эквадор перажыў разбуральны землятрус. Тады 660 чалавек загінулі, а дзясяткі тысяч засталіся без даху над галавой. МНС Беларусі дапамагло пацярпелым істотным гуманітарным грузам.

Цяпер жа ў Беларусі знаходзіцца дэлегацыя з Эквадора. Узначальвае яе міністр-каардынатар па пытаннях бяспекі Сэсар Навас Вера. Бакі ўчора падпісалі мемарандум аб узаемаразуменні па пытаннях супрацоўніцтва ў галіне папярэджання і кіравання ў катастрофах і надзвычайных сітуацыях.

— Акрамя таго, эквадорскі бок выказаў зацікаўленасць у падрыхтоўцы кадраў і закупках нашага выратавальнага абсталявання, — паведаміў Уладзімір Вашчанка. — Напрыклад, падчас наведвання Акадэміі навук увагу замежных гасцей прыцягнулі айчынныя беспілотнікі. Эквадор хацеў бы набываць гэтыя апараты ў нас.

Апошнім часам тэма бяспекі на будучай атамнай электрастанцыі гучала неадназова. Досвед аховы такіх збудаванняў беларускія ратавальнікі вывучаюць за мяжой.

— Ужо ўзведзена пажарнае дэпо, — паведаміў міністр. — Яно цалкам укамплектавана сучаснай тэхнікай і асабовым складам. Акрамя таго, працягваюцца сумесныя практычныя вучэнні з расійскімі ратавальнікамі па ліквідацыі надзвычайных сітуацый на атамных электрастанцыях. Напрыклад, гэты сцэнарый адпрацоўваўся на Смаленскай АЭС.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

■ Інавацыі і крэатыў

# Студэнтаў заразілі... «вірусам» навукі

## Міністэрства адукацыі плануе вылучыць 100 грантаў для маладых навукоўцаў

**«Сучасная навука — гэта камандная гульня. Час адзіночак прайшоў. Узровень даследаванняў і складанасці сучасных тэхналогій не дазваляюць вырашаць задачы ў адзіночку. Для гэтага патрабуюцца шматпрофільныя каманды спецыялістаў з самых розных галін, якія ўмеюць па-новаму паглядзець на праблему і знайсці нестандартныя рашэнні», — такую думку выказаў падчас фінальнага этапу Рэспубліканскага фестывалю маладзёжнай універсітэцкай навукі першы намеснік міністра адукацыі Вадзім БОГУШ.**


У час фестывалю.

Фота БЕЛТА.

Фестываль стартаваў у сценах Ліцэя БДУ ў студзені 2016 года і стаў адным з самых маштабных навуковых рэспубліканскіх маладзёжных мерапрыемстваў — за год ён завітаў ва ўсе рэгіёны краіны: **фестывальныя мерапрыемствы праходзілі на базе БДУ, Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларуска-Расійскага ўніверсітэта, Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта, Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта, БНТУ, БДПУ і Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта.** Ідэя праекта заключалася ў тым, каб заразіць студэнтаў «вірусам» навуковых пошукаў, прадставіць маладым даследчыкам пляцоўку для прэзентацыі іх ідэй. Сімвалічна, што і апошняя кропка была пастаўлена таксама ў Ліцэі БДУ, дзе падвялі вынікі года.

— Дзякуй і моладзі, якая прымала самы актыўны ўдзел ва ўсіх этапах фестывальных мерапрыемстваў, і іх педагогам, навуковым кіраўнікам, без якіх, безумоўна, былі б немагчымыя самыя першыя, яшчэ нясмелыя, крокі ў навуку, — падкрэсліў Вадзім Богуш. — На працягу года ў маладых навукоўцаў была магчымасць устанавіць кантакты са старэйшымі калегамі. Яны маглі абмеркаваць з імі праблемныя пытанні, паказаць сябе і ўбачыць свае перспектывы для далейшага прафесійнага росту. Мяркую, усе гэтыя мэты дасягнуты.

Вадзім Богуш адзначыў, што ў апошнія гады назіраецца прырост ахвотных паступіць у аспірантуру. «У маладых людзей ёсць жаданне займацца навукай. Але прафесія вучонага — не для ўсіх, а толькі для тых, хто з'яўляецца даследчыкам па сваёй сутнасці... Затое навука — найлепшая магчымасць для самарэалізацыі... Інавацыі, крэатыў, пошук новага там, дзе, здавалася б, ужо ўсё вядома і адкрыта, — прэрагатыва маладых і энергічных, тых, хто прагне адкрыццяў і гатовы да іх».

Вадзім Богуш запэўніў, што галоўнае адукацыйнае ведамства заўсёды будзе падтрымліваць ініцыятыўную моладзь. У 2017 годзе Міністэрства адукацыі Беларусі плануе вылучыць не менш як 100 грантаў для маладых навукоўцаў на правядзенне даследаванняў па актуальных праблемах.

У беларускіх ВНУ сёння дзейнічае больш як 200 студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый і 1000 навуковых гурткоў. Штогод у навуковых даследаваннях удзельнічаюць больш як 90 тысяч студэнтаў і аспірантаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Напярэдадні падзеі

# На сустрэчу з кнігай

## XXIV Мінская міжнародная кніжная выстава-кірмаш адбудзецца 8—12 лютага

**Як паведамілі ў Міністэрстве інфармацыі, сярод краін, якія сёлета будуць дэманстраваць сваю прадукцыю на выставе: Вялікабрытанія, Венесуэла, Германія, Грэцыя, Іран, Італія, Казахстан, Кітай, Карэя, Куба, Літва, Палесціна, Польшча, Расія, Сірыя, ЗША, Туркменістан, Турцыя, Украіна, Фінляндыя, Францыя, Швейцарыя, Швецыя, Эквадор, ну і, вядома, Беларусь. Грэцыя, дарэчы, стане ўдзельнікам выставы ў Мінску ўпершыню, падкрэслілі ў міністэрстве.**

Краіна — ганаровы госць XXIV Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу — Злучанае Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі. Буйныя калектыўныя экспазіцыі прадставяць Расія, Германія, Кітай, Іран, ЗША. Галоўныя тэмы цяперашняй выставы — 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, юбілеі класікаў беларускай літаратуры Якуба Коласа і Янкі Купалы. У праграме выставы 8—9 лютага — III Міжнародны сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час» з удзелам знакавых творцаў блізкага і далёкага замежжа, а таксама семінар маладых літаратараў. Упершыню адбудзецца ўзнагароджанне пераможцаў конкурсу маладых літаратараў «Першацвет», заснавальнікам якога з'яўляецца Міністэрства інфармацыі Беларусі, арганізатарамі — РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» і выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Кніжная выстава-кірмаш сёлета пройдзе ў адміністрацыйным комплексе па праспекце Пераможцаў, 14. Яе арганізатарам выступае Міністэрства інфармацыі Беларусі, суарганізатарамі — Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт, ААТ «Белкніга», ПК ТАА «Макбел».

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ**

## На слыху

# КОДЭКС АБ АДУКАЦЫІ: ШТО ЧАКАЕ ВЫШЭЙШУЮ ШКОЛУ?

**Гарантыі працаўладкавання для выпускнікоў ВНУ, якія навучаліся не толькі на бюджэтнай, але і на платнай аснове, будуць прадугледжаны ў новай рэдакцыі Кодэкса «Аб адукацыі». Як растлумачылі ў галоўным адукацыйным ведамстве краіны, студэнты платнай формы навучання, якія заявяць пра сваё жаданне размеркавацца і атрымаць накіраванне на працу, разам з першым працоўным месцам атрымаюць і статус маладога спецыяліста плюс усе прывілеі, якія ён дае.**

Якія яшчэ змяненні прапануюцца на ўзроўні вышэйшай адукацыі?

Усе ўстановы вышэйшай адукацыі плануецца прывесці да трох асноўных відаў: універсітэт, інстытут і акадэмія. Некаторыя з іх атрымаюць статус нацыянальных, іншыя будуць лічыцца вядучымі, астатнія застануцца звычайнымі навучальнымі ўстановамі вышэйшай адукацыі.

У новай рэдакцыі кодэкса будзе замацавана шматступеньчатасць вышэйшай школы, а таксама магчымасць для арганізацыі новых формаў адукацыйнага працэсу — такіх як дыстанцыйнае навучанне і сеткавае ўзаемадзеянне. Рэалізацыя сеткавага навучання дазволіць універсітэтам аб'ядноўваць свае рэсурсы ў падрыхтоўцы кадраў па той ці іншай спецыяльнасці, тым самым дасягаць большага эфекту ў навучанні і эканоміць фінансавыя сродкі. Такое ўзаемадзеянне магчымае як з беларускімі ўніверсітэтамі, так і з установамі вышэйшай адукацыі іншых краін, у першую чаргу краін Садружнасці.

Тэрмін адукацыйнай праграмы першай ступені, эквівалентнай бакалаўрыяту, будзе складаць 4—4,5 гады. Таксама прадугледжаны і трохгадовыя праграмы для выпускнікоў ССНУ.

Другі ўзровень — магістратура — паглыбленая вышэйшая адукацыя — прадугледжвае навучанне тэрмінам ад года да двух. Таксама будуць рэалізоўвацца бесперапынныя адукацыйныя праграмы. Гэты ўзровень прадугледжвае навучанне па спецыяльнасцях, напрыклад, медыцынскага профілю, па складаных тэхнічных спецыяльнасцях. Такія праграмы не дзеляцца на два ўзроўні і маюць тэрмін навучання ад 5 да 6 гадоў.

Плануецца істотнае пашырэнне акадэмічнай аўтаномнасці ВНУ за кошт пераходу ад тыпавой вучэбна-праграмнай дакументацыі да прыкладнай. Абавязковы кампанент, зафіксаваны на ўзроўні адукацыйнага стандарту, будзе складаць у адукацыйных праграмах бакалаўрыята да 50 працэнтаў. Астатнія 50 працэнтаў зместу будуць фарміраваць непасрэдна ВНУ з улікам тых задач, якія яны вырашаюць ва ўзаемадзеянні з заказчыкамі кадраў.

У магістарскіх адукацыйных праграмах на ўзроўні стандарту будзе фіксавацца і ўвогуле толькі 30 працэнтаў іх напаўнення, а 70% — аддаецца на разгляд ВНУ.

Цяпер у беларускіх ВНУ — занадта шырокі спектр спецыяльнасцяў і спецыялізацый: на першай ступені — каля 400 і больш як тысяча спецыялізацый і каля 300 спецыяльнасцяў прапануюць у магістратуры. Натуральна, што структура вышэйшай адукацыі павінна быць аптымізавана. У новым агульнадзяржаўным класіфікатары «Спецыяльнасці і кваліфікацыі», работа над якім завяршаецца, агульная колькасць спецыяльнасцяў вышэйшай адукацыі скарачаецца па асобных кірунках на 35—40%. Вылучаюцца 10 профіляў адукацыі, 26 кірункаў і 72 групы спецыяльнасцяў. Новы класіфікатар дазволіць дасягнуць больш высокага ўзроўню адпаведнасці патрэбам рынку працы і ўзгадніць нашы падыходы з сусветнымі і еўрапейскімі тэндэнцыямі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## Спорт-экспрэс

# НЕ ХАПІЛА ВОПЫТУ

**Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» Дар'я Лабажэвіч перадае з Руана, дзе праходзіць 25-ы чэмпіянат свету па гандболе**

**Пасля дзвюх гульняў з не самымі моцнымі дружынамі каманда Юрыя Шаўцова сустрэлася з больш грознымі харватамі. Гэтыя каманды гулялі адна з адной ужо больш за дзесяць разоў, але нашым хлопцам ніколі не ўдавалася ўзяць верх над сапернікам. Выключэння не здарылася і гэтым разам.**

Матч пачаўся з цудоўнага сэйва Вячаслава Салдаценкі, які абараняў вароты нашай каманды ў гэтай сустрэчы па чарзе з Іванам Мацкевічам. Гульня на сустрэчных курсах працягвалася аж да 50-й хвіліны, беларусы не пускалі фаварытаў сустрэчы далёка наперад, але і дагнаць іх ніяк не ўдавалася. Клас харватаў і маладосць нашых праявіліся бліжэй да канца матча, калі *яны былі цяжкімі, але ў матчы са зборнай Харватыі мы былі дастойныя 1-га ачка*.

Самым выніковым у нашай зборнай стаў Арцём Каралёк, на яго рахунку 7 закінутых мячоў. Па 5 галоў у Сяргея Шыловіча і Дзяніса Рутэнкі.

— *У параўнанні з папярэднімі матчамі мая каманда зрабіла крок наперад. Мы доўгі час змагаліся на роўных, але ў канцы сустрэчы ролю адыграў*



Вароты харватаў атакуе Арцём КАРАЛЁК.

Балканцы, якімі кіруе добра знаёмы беларускаму балельшчыку Жэлька Бабіч, вядома, больш дасведчаныя і тытулаваныя. У гісторыі харвацкай дружыны былі перамогі і п'едэсталы Алімпійскіх гульняў, чэмпіянатаў свету і Еўропы. Дарэчы, на леташнім кантынентальным першынстве ў Польшчы менавіта харваты (з якімі мы таксама сустракаліся ў групе) сталі бронзавымі прызёрамі. Але гэта ўжо толькі гісторыя, з камандай, якая прыехала сёлета ў Руан, можна было змагацца.

Менавіта з такім настроем і выйшлі на пляцоўку нашы хлопцы.

адрыў паступова стаў расці і ў выніку дасягнуў 6 мячоў. Фінішны свісток зафіксаваў такія лічбы на табло — 31:25, на жаль, не на нашу карысць.

— *У патрэбны момант у іх выдатна згуляў варатар, а мы не змаглі давесці свае кідкі да лагічнага завяршэння. Гэтага хапіла для перамогі харватаў*, — расказвае **Барыс ПУХОЎСКІ**. — *Думаю, мы прайгралі больш, чым заслугоўвалі. У нас па-ранейшаму шмат праблем у абароне. У канцоўцы зрабілі акцэнт не на тыя рэчы, таму ўсё так выйшла. Калі параўноўваць гэтую гульню з папярэднімі... Усе вопыт сапернікаў. Мае гульцы дзесьці рабілі памылкі, дзесьці нам не шанцавала, але ў цэлым перамога Харватыі цалкам заслужаная*, — адзначыў **галоўны трэнер беларусаў Юрый ШАЎЦОЎ**.

Сёння наша зборная сустракаецца з адным з прэтэндэнтаў на перамогу ў сусветным першынстве — зборнай Германіі, а завяршальны матч групавой стадыі беларусы правядуць 20 студзеня супраць зборнай Венгрыі.

Нагадаем, у плэй-оф з кожнай групы выйдуць каманды, якія занялі першыя 4 месцы ў сікстэце.

### Больш за 6,8 тысячы пасажыраў

перавезла поездам «Навагодні экспрэс» за час калядных і навагодніх свят Дзіцячая чыгунка імя К.С. Заслонава. Сёлета Дзіцячай дарогай разам з Мінскім Палацам культуры і спорту чыгуначнікаў на станцыі Сасновы Бор было арганізавана 50 тэатралізаваных паказаў «У госці да Дзеда Мароза».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

белагропромбанк
традиции будущего
ОАО «Белагропромбанк» сообщает, что с 03.04.2017 процентная ставка по договорам банковского вклада (депозита) до востребования «Пенсионный», заключенным до 25.11.2015, будет составлять 12,0% годовых.
ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
www.belapb.by
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

белагропромбанк
традиции будущего
ОАО «Белагропромбанк» сообщает, что с 20 февраля 2017 года по договорам срочного безотзывного банковского вклада (депозита) «Стандарт» в белорусских рублях с переменной процентной ставкой, сроком 370 дней, заключенным в период с 13.11.2015 по 16.08.2016 года составит – 20,5% годовых.
ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
www.belapb.by
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

Белинвестбанк
Настоящим ОАО «Белинвестбанк» уведомляет, что в публикации от 17.01.2017 была допущена неточность в части сроков вступления в силу новых процентных ставок по срочным банковским вкладам (депозитам) в белорусских рублях, заключенным до 18.01.2017. Уменьшение размера процентных ставок по указанным в публикации срочным банковским вкладам (депозитам) физических лиц в белорусских рублях будет производиться с **18.02.2017**.
146
www.belinvestbank.by
Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29. УНП 807000028.
Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь №3 от 03.06.2013

ИЗМЕНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ
Государственного предприятия «УКС Фрунзенского района г. Минска», опубликованной в газете «Звязда» 29.06.2016 №122 (28232) по объекту «Разработка комплексного архитектурного проекта жилой застройки с объектами инженерной инфраструктуры и улично-дорожной сети в границах улиц Шаранговича, Горецкого, Рафиева. Микрорайон №3. (2-я очередь строительства). Жилой дом №17 по генплану»
В абзаце 22: слова «26 (двадцать шесть) трехкомнатных квартир» заменить на слова «27 (двадцать семь) трехкомнатных квартир».
Абзац 23 изложить в следующей редакции: «Объект введен в эксплуатацию 29.12.2016 года»
УНП 190580553

# БУДУЧЫМ СПАРТЫЎНЫМ ЗОРКАМ

**У Брэсце адзначылі фіналістаў II абласной акцыі «Алімпійскі талент — 2016». Акцыя накіравана на падтрымку здольнай моладзі і развіццё алімпійскіх відаў спорту.**


Фота Валерыя КАРАЛЯ.
Юлія НЕСЦЯРЭНКА ўручае падарункі Насці ШКУРДАЙ.

На ўрачыстым сходзе ў Брэсцкім гарвыканкаме сабраліся 94 прадстаўнікі двух дзясяткаў відаў спорту ва ўзросце да 14 гадоў. Усе яны летась паказалі высокія вынікі на абласных, рэспубліканскіх і міжнародных спаборніцтвах. Юных спартсменаў віталі вядомыя майстры: Юлія Несцярэнка, Тамара Самахвалава-Давыдзенка, Андрэй Макараў, Віктар Братчэня. Усе яны разам з кіраўнікамі прадстаўніцтва Нацыянальнага алімпійскага камітэта ў Брэсцкай вобласці пажадалі юным талентам неўзабаве парадаваць землякоў алімпійскімі медалямі.

**Намеснік старшыні аблвыканкама Алег ВЯЛІЧКА** назваў імя ўладальніка Гран-пры акцыі. Ім стала Настасся Шкурдай, якая займаецца ў Брэсцкім абласным цэнтры алімпійскага рэзерву па водных відах спорту з трэнерам Вольгай Ясеновіч. У свае няпоўныя 14 гадоў Насця з'яўляецца шасціразовай пераможцай Міжнароднага турніру па плаванні Mad Wave Challenge, бронзавым прызёрам Кубка Беларусі па плаванні, а таксама шасціразовай чэмпіёнкай Алімпійскіх дзён моладзі Рэспублікі Беларусь. Дзяўчына атрымала крыштылёвы прыз акцыі, а таксама падарункі, сярод якіх кніга з аўтографамі знакамітых спартсменаў Брэстчыны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

## Грамадства

# АБВЯРЖЭННЯ НЕ БУДЗЕ

**Фігуранты «справы графіцістаў» падалі іск аб абароне гонару і годнасці. На думку Вадзіма Жаромскага, Максіма Пякарскага і Вячаслава Касінерава, якім у 2015 годзе было прад'яўлена абвінавачанне ў хуліганстве і пашкоджанні маёмасці, Следчы камітэт размясціў на сваім сайце недакладную інфармацыю.**

Маладыя людзі былі асуджаны за нанясенне графіці і закід фарбай білбордаў з выявай супрацоўнікаў міліцыі. Падчас разбіральніцтваў, 22 жніўня 2015 года, Следчы камітэт апублікаваў паведамленне пра затрыманне «хуліганаў за серыю наўмысных дзёрзкіх выхадак», таксама адзначалася, што некаторыя выданні спрабуюць надаць ім «статус актывістаў, якія выказваюць свае палітычныя думкі». Істцы сцвярджалі, што гэта, нягледзячы на тое, што канкрэтныя імёны і прозвішчы не называюцца, ускосным чынам паказвае на іх, акрамя таго, да хуліганаў іх прылічылі неабгрунтавана, да вынясення прысуду. Дарэчы, абвінавачанні ў хуліганстве пазней знялі. Таксама ў тэксце сказана, што ўстаноўлены факты распаўсюджвання затрыманымі экстрэмісцкіх матэрыялаў, у прыватнасці тых, якія маюць нацысцкую сімволіку і атрыбутыку, і выказванняў, якія абражаюць ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. На сайце СК была змешчана інфармацыя, што «ў зламысніках знойдзены і канфіскаваны траўматычны пісталет», які, як пасля высветлілася, аказаўся пнеўматычным.

Істцы патрабавалі абвяржэння інфармацыі, матэрыяльная кампенсацыя іх не цікавіла. Бок абвінавачання спрабаваў апеляваць тым, што многія інтэрнэт-выданні, узяўшы за аснову паведамленне Следчага камітэта, апублікавалі артыкулы з указанне імёнаў і прозвішчаў. Аднак суддзя Андрэй Кочык адмовіў у далучэнні да матэрыялаў справы раздрукоўкі артыкулаў у прэсе. Прадстаўнікі Следчага камітэта растлумачылі безгрунтоўнасць іску тым, што інфармацыя падавалася, зыходзячы з абставін крымінальнай справы, але, з прычыны таго, што персанальных даных у тэксце няма, ідэнтыфікаваць асобы абвінавачаных немагчыма. Так што іх гонар і годнасць не маглі быць закранутыя. Суд Партызанскага раёна Мінска адмовіў у задавальненні іску.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

# УЛАСНЫ «ПЛАСТЫК» З ХІТРЫКАМІ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Акрамя таго, некаторыя банкі даюць магчымасць афармляць ліміты па катэгорыях прадпрыемстваў гандлю і сэрвісу. Дзякуючы такой функцыі вы можаце забараніць праводзіць аперацыі па картцы, скажам, у казіно — калі вы гульняман. Падобнае абмежаванне можа стаць вельмі карысным, калі вы чалавек настрою. Пры гэтым вы без праблем купіце прадукты ў супермаркеце або абноўкі ў гандлёвым цэнтры.

## Карысць на практыцы

Абмежаванні самі па сабе апрыёры ўспрымаюцца шараговым абывацелем негатыўна. Аднак ліміты па банкаўскіх плацежных картках — асаблівы выпадак. Яны неабходны для бяспекі вашых уласных грошай. Калі вы — шчаслівы ўладальнік адзінай, універсальнай карткі, якая адначасова служыць вам і зарплатнай, і ашчаднай, з ёй вы ездзіце за мяжу і ёй жа разлічваецеся ў інтэрнэце — без лімітаў вам ніяк не абысціся.

— Карыстацца такой картай можна толькі пры наяўнасці лімітаў і з пастаянным кіраваннем імі, — лічаць эксперты БЕЛКАРТ. — Але нават калі ў вас прадугледжаны асобныя карткі для аперацый у інтэрнэце і для паездак за мяжу, усё роўна рэкамендуецца карыстацца лімітамі.

Логіка тут простая — як вядома, большая частка ашуканскага трафіка па плацежных картках ідзе да нас з-за мяжы. Часта «пластыкі» беларусаў счытваюцца ў ходзе замежных паездак. Але нават калі інфармацыя з карткі была скапіравана на тэрыторыі Беларусі, вялікая імавернасць таго, што грошы будуць здымацца дзе-небудзь за мяжой. Калі вы сапраўды ведаеце, што ў найбліжэйшы час Радзіму пакідаць не будзеце — абмяжуйце магчымасць правядзення аперацый па вашай картцы за мяжой. І ў выпадку форс-мажору, хутчэй за ўсё, ашуканцу не ўдасца выкрасці ў вас ні рубля.

Увогуле, спецыялісты катэгарычна рэкамендуюць для картак, якімі карыстаюцца кліенты за межамі краіны, у любым выпадку вызначаць ліміты. Калі ў вас ёсць зберагальная карта, і вы хочаце перыядычна ёй карыстацца на тэрыторыі Беларусі, але баіцеся рызыкаваць усёй сумай — ліміты зноў прыйдуць да вас на дапамогу. Калі нешта адбудзецца , менавіта яны дазволяць мінімізаваць страты ад махляроў.

## Давяраць і не баяцца

Акрамя бяспекі, ліміты вельмі зручныя для дзіцячых карт. У пераважнай большасці выпадкаў для дзяцей да 14 гадоў нельга аформіць асабістую картку. Вы можаце аформіць толькі дадатковы «пластык» да рахунку аднаго з бацькоў. Але ж вы не хочаце, каб дзіця мела свабодны доступ да ўсёй вашай зарплаты? Таму вы і робіце пэўны ліміт, пасля чаго дзіцяці будзе даступна роўна столькі грошай, колькі вы палічыце патрэбным. Акрамя таго, па дзіцячых картках зручна вызначаць ліміты па зняцці наяўных грошай або ліміты па катэгорыі гандлёвых пунктаў. Вядома, дзеці не зусім разумеюць, як працуюць ліміты, але сам факт прысутнасці такіх абмежаванняў дысцыплінуе малых і супакойвае дарослых. Напрыклад, у маёй больш дарослай дачкі (шосты клас) тыднёвы ліміт складае 7 рублёў, а ў васьмігадовага сына — 3 рублі. Цяпер па іх картках ім кожны тыдзень даступныя толькі гэтыя сродкі.

## Кіраванне абмежаваннямі

У нашай краіне распаўсюджаны два варыянты кіравання лімітамі — праз асабістую падачу заявы ў банк альбо шляхам самастойнай карэкціроўкі праз інтэрнэт-банкінг. На жаль, сёння ў Беларусі банкаў, якія даюць кліентам магчымасць кіраваць лімітамі праз інтэрнэт-банкінг, пакуль няшмат. Як правіла, вы атрымліваеце картку з ужо прапісанымі лімітамі, і, калі ўзнікае неабходнасць іх змяніць, вам трэба звяртацца ў свой банк і пісаць заяву. Яшчэ адзін магчымы варыянт — патэлефанаваць у банк па спецыяльным тэлефоне, паведаміць тайную інфармацыю (гэта звычайна дзявочае прозвішча мамы), пасля чаго ўзнікае магчымасць мяняць ліміты. Аднак і такая практыка існуе далёка не ва ўсіх беларускіх банках.

**Па дзіцячых картках зручна вызначаць ліміты па зняцці наяўных грошай або ліміты па катэгорыі гандлёвых пунктаў.**

Тым не менш банкі, якія дазваляюць мяняць ліміты не выходзячы з дому, ёсць — варта іх толькі пашукаць. Праз інтэрнэт-банкінг ліміты мяняюцца практычна ўмомант. Пры асабістым візіце ў банк тэрміны могуць быць рознымі, але кіраванне ўжо сапраўды адбываецца не ў рэжыме рэальнага часу. Калі чалавек збіраецца аператыўна кіраваць лімітамі, разумее, што і для чаго ён робіць, яму неабходна мець такі інструмент, які дазваляе мяняць ліміты ў рэжыме анлайн. Інакш у гэтым няма амаль ніякага сэнсу.

## Дробязяў тут няма

Перад тым як прыступіць да кіравання лімітамі, трэба ўдакладніць у банку ўсе нюансы. Якія тыпы лімітаў можна рабіць, якім чынам імі кіраваць і як гэтыя ліміты пералічваюцца. Напрыклад, калі вы вызначаеце ліміт па колькасці або аб'ёме аперацый на тыдзень — лепш адразу ўдакладніць, з якога моманту пачнецца адлік новай сямідзёнкі: з даты першай аперацыі, або з даты ўстанаўлення ліміту?

Звярніце ўвагу, што часам можна сутыкнуцца з гранічным лімітам, выйсці за рамкі якога немагчыма. Таму непасрэдна перад буйной купляй ліміт па безнаяўнай аплаце трэба часова павялічыць. Падобныя абмежаванні звычайна сустракаюцца і па міжнародных трансакцыях. Яны звязаны з міжнароднымі патрабаваннямі. Але гэтыя ліміты даволі высокія — да 10 000 долараў на суткі. Пры гэтым у большасці выпадкаў можна звярнуцца ў банк і наогул зняць ліміты. Як правіла, гэта не з'яўляецца непераадольным бар'ерам.

Вядомыя выпадкі, калі банкі ў аднабаковым парадку рабілі рознага роду ліміты па плацежных картках кліентаў. Як правіла, такія дзеянні звязаны з рознага роду форс-мажорамі. Напрыклад, падчас крызісу 2011 года многія банкі вызначалі ліміты на правядзенне аперацый за мяжой па картках, намінаваных у беларускіх рублях. Такім чынам банкі мінімізавалі ўласныя валютныя рызыкі. Тэарэтычна банк, вядома, мае права ўводзіць абмежаванні ў адпаведнасці з дзеючым дагаворам і нават без тлумачэння прычын. Аднак дзеля аб'ектыўнасці трэба адзначыць, што на практыцы не было выпадкаў, калі банк устанавіў ліміты для нейкага канкрэтнага чалавека па выніках аналізу яго аперацый.

Іншае пытанне, што банкі часам выкарыстоўваюць ліміты ў якасці маркетынгавага ходу. Напрыклад, вы купляеце картку ў рамках нейкага пакета паслуг. І калі пакет паслуг, магчыма, каштуе 10 рублёў, то ліміт, скажам, наяўнага зняцця па картцы складзе 10 тысяч рублёў, а калі ўзяць даражэйшы пакет — то і ліміт будзе вышэйшы.

Часам трымальнік банкаўскай карткі пры вызначэнні лімітаў можа сутыкнуцца з краінавымі праблемамі, звязанымі з электроннай камерцыяй. Напрыклад, вы збіраецеся ў Польшчу і, адпаведна, здымаеце абмежаванні на Польшчу. А потым спрабуеце правесці трансакцыю ў Польшчы — і не можаце, таму што інтэрнэт-крама абслугоўваецца ў банку іншай дзяржавы. Адпаведна, трансакцыя ўспрымаецца сістэмай, як не польская. Гэта даволі рэдкі выпадак, але ўсё ж ён можа здарыцца.

## Мець сваю канцэпцыю

Часам падобныя праблемы могуць узнікнуць з прычыны некарэктнай рэгістрацыі катэгорыі прадаўца. Катэгорыі вызначаюцца банкам-эквайерам, і часам сустракаюцца крамы, якія складана дакладна ідэнтыфікаваць — напрыклад, крамы з шырокім асартыментным пералікам або крамы, якія прадаюць нейкія спецыфічныя тавары. І калі вы свядома блакуеце той ці іншы тып аплаты тавараў ці паслуг, трансакцыя можа не прайсці, таму што катэгорыя крамы няправільна прапісана вашым банкам. Зразумела, што такіх праблем не ўзнікне з папулярнымі супермаркетамі.

Ліміты — рэч, безумоўна, карысная і зручная, але яна патрабуе ўвагі і пэўнага ўзроўню фінансавай адукаванасці. Калі вы прынялі рашэнне старанна кіраваць лімітамі, то для пачатку трэба выпрацаваць уласную канцэпцыю кіравання картачнымі прадуктамі. Трэба разумець, што для вас зручна, а што не, не забываць рабіць і здымаць ліміты і наогул пастаянна цікавіцца тым, што адбываецца ў плацежных сістэмах. А ў якасці ўзнагароды за гэтую няпростую працу вы атрымаеце практычна поўную бяспеку для вашых грашовых сродкаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*


# РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «На волне успеха!»

**Сведения об организаторе:**
Общество с ограниченной ответственностью «360 медиа групп», далее именуемое «Организатор», адрес: 223051, Минская обл., Минский р-н, п. Колодищи, ул. Минская, дом 5, к. 18. Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета № 0046451 от 11 апреля 2008 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690318126, свидетельство о государственной регистрации выдано 24 апреля 2008 г.

**Наименование Рекламной игры:**
Рекламная игра носит название «На волне успеха!».

**Сроки проведения Рекламной игры:**
Рекламная игра проводится с 7 сентября 2016 года по 18 января 2017 года (включая период розыгрышей и вручения призов).

**Сведения о государственной регистрации Рекламной игры:**
Свидетельство о регистрации Рекламной игры № 2815 от 30 августа 2016 года выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

**Количество участников Рекламной игры:**
Всего к участию в игре было допущено 110 172 участника, полностью соответствующих требованиям Правил Рекламной игры.

**Сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда:**
Призовой фонд в размере **21 767,67** (двадцать одна тысяча семьсот шестьдесят семь) белорусского рубля и 67 копеек в денежных знаках образца 2009 года или **217 676 700** (двести семнадцать миллионов шестьсот семьдесят шесть семьсот) белорусских рублей в денежных знаках образца 2000 года был разыгран полностью.

**Победители по результатам первого розыгрыша от 11 октября 2016 года:**

| Фамилия, инициалы победителя | Выигрыш |
|---|---|
| Никуйко Александр Михайлович | Приз 1-й категории: Ноутбук HP 250 (J4T56EA) и денежный приз для уплаты подоходного налога 145,29 в денежных знаках образца 2009 года /1 425 900 в денежных знаках образца 2000 года |
| Максимович Александр Николаевич | Приз 2-й категории: Смартфон Samsung Galaxy S6/G920F и денежный приз для уплаты подоходного налога 1363,20 в денежных знаках образца 2009 года /13 622 000 в денежных знаках образца 2000 года |
| Казинец Елизавета Александровна | |
| Зубарева Татьяна Владимировна<br>Курец Юлия Владимировна<br>Петрашкевич Леонид Леонидович<br>Янукович Дмитрий Павлович<br>Антонова Светлана Викентьевна<br>Юдина Ольга Олеговна<br>Скуратович Николай Валентинович<br>Смоляков Илья Юрьевич<br>Вавренюк Елена Александровна<br>Мороз Марина Ивановна<br>Ткаченко Евгений Александрович<br>Демин Виктор Сергеевич<br>Шершунович Наталья Васильевна<br>Жилевич Александр Юрьевич<br>Шинкевич Людмила Ивановна<br>Королев Артем Сергеевич<br>Михновец Анна Владимировна<br>Куксо Елизавета Александровна<br>Курпешко Вадим Геннадьевич<br>Баранович Александр Петрович<br>Дробышевский Денис Игоревич<br>Черненок Евгения Вячеславовна<br>Холманских Евгений Александрович<br>Белькович Анастасия Валерьевна<br>Венесковская Анастасия Александровна<br>Довнар Марина Николаевна<br>Романчук Роман Игоревич<br>Степаненко Екатерина Вячеславовна<br>Пашкевич Галина Иосифовна<br>Матецкая Надежда Константиновна | Приз 3-й категории: Парный подарочный сертификат на услуги компании ИООО «Квитки Бел» (kvitki.by) стоимостью 500 000 BYR /50,00 BYN каждый, на общую сумму 1 000 000 BYR /100,00 BYN. Срок действия сертификата с 1 января 2017 года по 31 декабря 2017 года и денежный приз для уплаты подоходного налога 100,000 /в денежных знаках образца 2009 года/1 000 000 в денежных знаках образца 2000 года |

**Победители по результатам второго розыгрыша от 10 ноября 2016 года:**

| Фамилия, инициалы победителя | Выигрыш |
|---|---|
| Шичко Алеся Андреевна | Приз 1-й категории: Ноутбук HP 250 (J4T56EA) и денежный приз для уплаты подоходного налога 145,29 в денежных знаках образца 2009 года /1 425 900 в денежных знаках образца 2000 года |
| Дулько Николай Федорович | Приз 2-й категории: Смартфон Samsung Galaxy S6/G920F и денежный приз для уплаты подоходного налога 1363,20 в денежных знаках образца 2009 года/ 13 622 000 в денежных знаках образца 2000 года |
| Михлюк Анастасия Александровна | |
| Туборцев Руслан Михайлович<br>Городецкий Владимир Викторович<br>Ковалевский Дмитрий Николаевич<br>Калилец Наталья Викторовна<br>Смирнова Марина Ивановна<br>Кравцова Светлана Ивановна<br>Жигар Александр Николаевич<br>Цынгель Наталья Валентиновна<br>Шадуро Наталья Михайловна<br>Кравчик Юлия Александровна<br>Ларюшин Дмитрий Григорьевич<br>Ващилко Дарья Николаевна<br>Козел Елена Георгиевна<br>Капская Наталия Михайловна<br>Силков Михаил Ермолаевич<br>Адамонис Людмила Станиславовна<br>Остриков Никита Андреевич<br>Воробьева Вероника Олеговна<br>Лагутенко Сергей Сергеевич<br>Беляк Ростислав Петрович<br>Сушко Юлия Леонидовна<br>Мякота Алексей Вячеславович<br>Сырица Вадим Карлович<br>Киселева Екатерина Игоревна<br>Мирончик Александр Александрович<br>Чиж Рита Николаевна<br>Гурский Иван Сергеевич<br>Макей Александр Владимирович<br>Господарик Виталий Владимирович<br>Костюк Марина Александровна | Приз 3-й категории: Парный подарочный сертификат на услуги компании ИООО «Квитки Бел» (kvitki.by) стоимостью 500 000 BYR / 50,00 BYN каждый, на общую сумму 1 000 000 BYR /100,00 BYN. Срок действия сертификата с 1 января 2017 года по 31 декабря 2017 года и денежный приз для уплаты подоходного налога 100,00 /в денежных знаках образца 2009 года /1 000 000 в денежных знаках образца 2000 года |

**Победители по результатам третьего розыгрыша от 9 декабря 2016 года:**

| Фамилия, инициалы победителя | Выигрыш |
|---|---|
| Первенецкий Артем Петрович | Приз 1-й категории: Ноутбук HP 250 (J4T56EA) и денежный приз для уплаты подоходного налога 145,29 в денежных знаках образца 2009 года/1 425 900 в денежных знаках образца 2000 года |
| Газизов Ринат Кашафович | Приз 2-й категории: Смартфон Samsung Galaxy S6/G920F и денежный приз для уплаты подоходного налога 1363,20 в денежных знаках образца 2009 года/13 622 000 в денежных знаках образца 2000 года |
| Журавская Людмила Валентиновна | |
| Горлов Вячеслав Михайлович<br>Сахончик Раиса Ивановна<br>Рябая Алена Юрьевна<br>Мацкевич Татьяна Андреевна<br>Ивановский Виталий Владиславович<br>Борисевич Кристина Антоновна<br>Лецко Вадим Валентинович<br>Иваненко Ирина Александровна<br>Алексеенок Екатерина Александровна<br>Фролов Денис Владимирович<br>Архипова Валерия Артуровна<br>Арутюнов Тариель Тариелевич<br>Денисенко Леонид Леонидович<br>Жих Ольга Анатольевна<br>Садовская Татьяна Николаевна<br>Бычков Иван Иванович<br>Тычинский Сергей Александрович<br>Толстик Екатерина Сергеевна<br>Дегтярева Татьяна Казимировна<br>Макаренко Светлана Викторовна<br>Грибова Яна Андреевна<br>Суздалева Ирина Витальевна<br>Кривенок Надежда Александровна<br>Журавская Екатерина Сергеевна<br>Циберев Дмитрий Валерьевич<br>Денисюк Виктория Васильевна<br>Барсуков Александр Александрович<br>Заболотников Андрей Николаевич<br>Лещев Дмитрий Евгеньевич<br>Горобец Вероника Валерьевна | Приз 3-й категории: Парный подарочный сертификат на услуги компании ИООО «Квитки Бел» (kvitki.by) стоимостью 500 000 BYR /50,00 BYN каждый, на общую сумму 1 000 000 BYR /100,00 BYN. Срок действия сертификата с 1 января 2017 года по 31 декабря 2017 года и денежный приз для уплаты подоходного налога 100,00/в денежных знаках образца 2009 года /1 000 000 в денежных знаках образца 2000 года |

**Сведения о наименовании и дате выхода печатного средства массовой информации, в котором опубликованы правила проведения Рекламной игры, и сведения о результатах проведения рекламной игры:**
Публикация правил рекламной игры – газета «Звязда», №169, дата 02.09.2016.
Публикация сведений о результатах проведения рекламной игры – №11, дата 18.01.2017. Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: + 375 17 279 87 77.

Дзяржава для народа
# Мясцовае Самакіраванне
Газета выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
18 студзеня 2017 г.
№ 22 (385)
СПЕЦЫЯЛЬНЫ ВЫПУСК

# ЛІДА СУСТРАКАЕ ГАСЦЕЙ




**Паслязаўтра ў Лідзе адбудзецца выязное пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, падчас якога ўдзельнікі сустрэчы наведаюць шэраг прадпрыемстваў і сацыяльных аб'ектаў, прааналізуюць іх работу і абмяркуюць, як у раёне і Гродзенскай вобласці выконваецца Закон «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» ў святле рэалізацыі выніковых дакументаў V Усебеларускага народнага сходу.**

**Напярэдадні падзеі нашы карэспандэнты пагутарылі з удзельнікамі мерапрыемства, наведалі Лідскі раён, пабывалі на прадпрыемствах, якімі ганарацца лідчане, пазнаёміліся з людзьмі, што «пішуць гісторыю» сённяшняй Лідчыны. Сваімі ўражаннямі яны дзеляцца з чытачамі на старонках сённяшняга спецвыпуску.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.



стар. 5

**Ці не самая надзённая праблема — працаўладкаванне. У горадзе знаходзіцца адно буйное прадпрыемства — шклозавод «Нёман». Вакансіі ў сацыяльнай сферы запоўненыя, вольных месцаў няма.**



стар. 6

**Як дызайнерскія вырабы ў адзенні, так і вырабы бярозаўскіх мастакоў — унікальныя і прыгожыя. Калекцыі са шкла будуць выходзіць абмежаванымі партыямі, гэта значыць, калі не паспееў заказаць калекцыю — розлічвай на вырабы тыражныя.**



стар. 8

**Не выпадкова працаваць на «Бел–Пласт Інтэрнэшнл» лічыцца прэстыжным. Не дзіва, што вакансіі тут бываюць рэдка — кожны трымаецца за сваё працоўнае месца. Стабільная заработная плата, прычым большая за сярэднюю па краіне, — тое, што ў сённяшняй эканамічнай сітуацыі вельмі патрэбна людзям.**

# ДЗЕ ПАЧАТАК ДЭМАКРАТЫІ

## Спікер верхняй палаты парламента пра ролю дэпутатаў розных узроўняў

**У многім магчымасць людзей самім фарміраваць органы ўлады на месцах стала адным з самых важкіх дасягненняў савецкай дзяржавы. Аднак пасля яна распалася, і ў адрас органаў мясцовага самакіравання пасыпалася шмат заўваг. Тым не менш яны засталіся. Якая роля іх сёння? Ці патрэбна аптымізацыя мясцовых Саветаў? Якім павінна быць іх узаемадзеянне з парламентарыямі? На гэтыя і іншыя пытанні «МС» адказаў Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу.**



Фота Юрыя ІВАНОВА.

### Чалавек — галоўная задача

***— Міхаіл Уладзіміравіч, Прэзідэнт нашай краіны неаднойчы адзначаў, што Беларусь — гэта дзяржава для народа, а ўважлівае стаўленне да чалавека — галоўная задача і вертыкалі ўлады, і народных выбраннікаў на ўсіх узроўнях. На Ваш погляд, на што сёння ў першую чаргу павінны быць нацэлены дэпутаты? Што павінна з'яўляцца галоўным аб'ектам іх увагі?***

— Павышэнне жыццёвага ўзроўню беларускіх грамадзян — гэта галоўная мэта дзяржаўнай палітыкі і наша стратэгічная задача, якая вызначаецца пяццю найважнейшымі складнікамі: паўнавартасная сям'я, здароўе, адукацыя, рэальныя даходы, камфортнасць жыцця. Менавіта праз іх прызму варта разглядаць усю нашу далейшую працу. У рэалізацыі гэтай задачы павінны быць актыўна задзейнічаны парламентарыі, органы мясцовага кіравання і самакіравання.

Працуючы ў рэгіёнах, члены Савета Рэспублікі надаюць асаблівую ўвагу тым праблемам і недапрацоўкам, якія тармозяць развіццё падведамасных тэрыторый і перашкаджаюць людзям жыць больш годна. Новыя тэхналогіі, сучасныя вытворчасці — гэта добра, але за імі трэба бачыць чалавека, усё, што звязана з жыццём, побытам, культурай і дабрабытам нашых людзей.

Канструктыўнае супрацоўніцтва членаў Савета Рэспублікі з органамі прадстаўнічай улады ўсіх узроўняў, аблвыканкамамі дае магчымасць вырашаць шматлікія праблемы, якія выклікаюць негатыўны рэзананс у грамадстве, улічваць і выкарыстоўваць у заканатворчай дзейнасці парламентарыяў абагульненыя прапановы і пажаданні мясцовых Саветаў і дазваляе зрабіць працэс распрацоўкі і прыняцця законаў больш мабільным, узважаным і эфектыўным.

***— Ці цалкам выкарыстоўваецца патэнцыял дзевятнаццаці тысяч дэпутатаў Саветаў дэпутатаў?***

— Мясцовае самакіраванне — гэта не толькі інстытут публічнай улады, але і грамадскай самаарганізацыі. Сапраўды, праз мясцовы ўзровень улады пралягае самы кароткі і прамы шлях да вырашэння жыццёва важных праблем грамадзян. Акрамя таго, на мясцовым узроўні могуць найбольш поўна рэалізавацца прынцыпы «нізавой дэмакратыі», або, як яе яшчэ называюць, «дэмакратыі ўдзелу».

У сувязі з гэтым асаблівая ўвага да мясцовых Саветаў дэпутатаў, дэпутацкага корпуса з боку кіраўніка дзяржавы — гэта шчырае жаданне ператварыць іх у дзейсную сілу, накіраваную на вырашэнне пытанняў жыццядзейнасці насельніцтва. У Саветах аб'яднана найбольш палітычна сталая і дасведчаная частка нашага насельніцтва. Праз Саветы дзясяткі тысяч грамадзян удзельнічаюць у кіраванні справамі дзяржавы і грамадства, гэта значыць — у ажыццяўленні рэальнай палітыкі. Дэпутаты з'яўляюцца злучальным звяном паміж уладай і народам — у гэтым вялікая адказнасць народных выбраннікаў перад грамадствам і дзяржавай.

Часам дэпутатаў крытыкуюць за тое, што яны недастаткова актыўныя, што пакуль далёка не заўсёды адчуваюцца іх роля і ўплыў пры вырашэнні праблем мясцовага жыцця, а прадастаўленыя заканадаўствам правы і паўнамоцтвы выкарыстоўваюцца вельмі нясмела. Шмат у чым гэта крытыка справядлівая. Дэпутаты, працуючы ў цесным кантакце з органамі выканаўчай улады на месцах, маглі б больш адчувальна ўплываць на кіраванне эканамічным і сацыяльным развіццём рэгіёнаў краіны, на больш эфектыўнае выкарыстанне ўнутраных матэрыяльных, працоўных, фінансавых, зямельных і іншых рэсурсаў.

Калі мы хочам, каб людзі праяўлялі самастойнасць і ініцыятыву, то трэба пачынаць з асветы. Таму ў цяперашніх умовах нельга разглядаць дзейнасць мясцовых Саветаў дэпутатаў па сацыяльна-эканамічным развіцці тэрыторыі ў адрыве ад ідэалагічнай работы. У сувязі з гэтым варта ўзмацніць працу дэпутатаў мясцовых Саветаў з маладзёжнымі аб'яднаннямі, вучнёўскай і студэнцкай моладдзю па павышэнні ўзроўню палітычнай адукаванасці, маральнасці, іх сацыяльнай і грамадзянскай актыўнасці. Усё гэта павінна стаць дадатковым рэсурсам (інтэлектуальным, чалавечым) у вырашэнні актуальных праблем дабрабыту насельніцтва ў рэгіёнах.

### Для развіцця ёсць рэзервы

***— Падчас III Форуму рэгіёнаў, які адбыўся летам у Мінску, кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на важнасці ўдзелу мясцовага самакіравання ўсіх узроўняў у міжрэгіянальным супрацоўніцтве. Наколькі актыўна падключыліся да гэтага рэгіёны?***

— Правядзенне па ініцыятыве Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі форумаў рэгіёнаў Беларусі і Расіі стала добрай традыцыяй. Ужо адбыліся тры такія форумы. У двух з іх прынялі ўдзел Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка і Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Уладзіміравіч Пуцін. Форумы рэгіёнаў сталі сур'ёзнай пляцоўкай для канструктыўнага дыялогу па розных напрамках супрацоўніцтва.

Сёння ў нас ёсць даручэнне прэзідэнтаў дзвюх краін Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі і Уладзіміра Уладзіміравіча Пуціна — шырэй выкарыстоўваць рэзервы рэгіянальнага супрацоўніцтва. Для выканання гэтага даручэння і рашэнняў трэцяга Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі Саветам Рэспублікі і Саветам Федэрацыі ўжо рэалізуецца шэраг мерапрыемстваў. Прынцыповымі пры гэтым з'яўляюцца некалькі навацый: гарманізацыя нарматыўных прававых актаў і правапрымяняльнай практыкі, прыярытэт эканамічнага супрацоўніцтва, уцягненне ў гэты працэс моладзі, а таксама апора на рэгіянальныя праекты і ініцыятывы.

У рамках рэалізацыі плана па актывізацыі супрацоўніцтва ў галіне мясцовага самакіравання паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй у жніўні 2016 года ў Магілёве адбыўся форум Магілёўскай вобласці Рэспублікі Беларусь і Бранскай вобласці Расійскай Федэрацыі. У яго ходзе абмяркоўваліся пытанні міжрэгіянальнага супрацоўніцтва ў сферы маладзёжнай палітыкі ў Саюзнай дзяржаве. Неабходна адзначыць, што мерапрыемства прайшло з высокай выніковасцю і мела практычны характар і эканамічную накіраванасць. У ходзе форуму былі падпісаны шэраг пагадненняў аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве і планы мерапрыемстваў па рэалізацыі гэтых пагадненняў паміж рэгіёнамі Магілёўшчыны і Браншчыны.

Магілёўская і Бранская вобласці з'яўляюцца піянерамі ў арганізацыі рэгіянальнага ўзаемадзеяння на прынцыпова новых умовах, таму гэта мерапрыемства па праву можна лічыць Днём рэгіёна і пачаткам вялікай працы. Абяцае быць эфектыўным узаемадзеянне Брэсцкай і Ленінградскай абласцей. Варта адзначыць, што і іншыя рэгіёны рэспублікі актыўна ўключыліся ў гэту работу.

У цяперашні час рыхтуецца чацвёрты Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Ён пройдзе летам 2017 года ў Маскве і будзе прысвечаны пытанням інтэграцыйнага развіцця рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў сферы высокіх тэхналогій, інавацый і інфармацыйнага грамадства.

### Удасканальваць тое, што маем

***— Ці ёсць сёння неабходнасць у аптымізацыі сістэм прадстаўнічай улады, а менавіта яе нізавога ўзроўню?***

— Пытанне рэфармавання сістэмы мясцовага самакіравання ў Рэспубліцы Беларусь дэталёва вывучалася ў Савеце Рэспублікі, вядучымі навукоўцамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і старшынямі мясцовых Саветаў дэпутатаў.

У якасці пераўтварэнняў прапаноўвалася, у прыватнасці, перайсці на двухузроўневае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне (вобласць — раён), а таксама ліквідаваць сельскія Саветы і іх выканкамы, замяніўшы іх мясцовай адміністрацыяй. Было прынята рашэнне аб тым, што на сёння няма палітычных, сацыяльных і эканамічных перадумоў для змены сістэмы мясцовага самакіравання, якая склалася ў краіне. Дадзеная прапанова падтрымана кіраўніком дзяржавы.

Лічу, што сёння з улікам новых рэалій часу трэба развіваць і ўдасканальваць існуючую сістэму мясцовага самакіравання, прымаць усе неабходныя меры для актывізацыі работы і павышэння адказнасці мясцовых Саветаў за рашэнне больш шырокага кола сацыяльна-эканамічных пытанняў і надзённых праблем людзей.

***— У 2007 годзе пры Савеце Рэспублікі быў створаны Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання — для каардынацыі дзейнасці мясцовых Саветаў дэпутатаў. Якімі Вам бачацца сёння першачарговыя задачы гэтага органа?***

— Савет быў створаны як калегіяльны дарадчы орган для распрацоўкі прапаноў па далейшым удасканаленні дзейнасці органаў мясцовага самакіравання і арганізацыі ўзаемадзеяння паміж імі і органамі дзяржаўнага кіравання.

Задача, якая вырашалася праз утварэнне такой структуры, — забеспячэнне каардынацыі ўзаемадзеяння паміж Саветам Рэспублікі, органамі мясцовага самакіравання і органамі дзяржаўнага кіравання з мэтай дасягнення канкрэтных вынікаў шляхам вывучэння актуальных праблем у рэгіёнах, іх аналізу і абагульнення. Савет заклікаюць павысіць эфектыўнасць прымаемых кіраўніцкіх рашэнняў і выпрацаваць дзейсны механізм «зваротнай сувязі» з насельніцтвам, а таксама садзейнічаць органам прадстаўнічай улады ў вырашэнні праблем людзей. Работа Савета на працягу амаль 10 гадоў дазволіла павысіць даступнасць і аператыўнасць вырашэння шматлікіх рэгіянальных і тэрытарыяльных праблем.

Аднак з улікам новых стратэгічных задач па сацыяльна-эканамічным развіцці краіны, выразна абазначаных на пятым Усебеларускім народным сходзе, у работу Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання неабходна ўнесці адпаведныя карэктывы.

У цяперашні час Саветам Рэспублікі прапрацоўваюцца новыя падыходы да далейшага развіцця мясцовага самакіравання ў краіне. Гэта работа накіравана на ўзмацненне ролі мясцовых Саветаў у вырашэнні праблем жыццезабеспячэння насельніцтва, на выпрацоўку механізмаў ініцыявання Саветамі прававога і арганізацыйнага вырашэння ўказаных пытанняў. У гэтых мэтах у Савеце Рэспублікі створана рабочая група пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Папкова Аляксандра Андрэевіча. Пасля аналізу становішча спраў у рэгіёнах і дзеючага заканадаўства будуць выяўлены «вузкія» месцы ў працы мясцовых органаў улады, а таксама патэнцыйныя магчымасці і рэсурсы мясцовага самакіравання, якія зараз не выкарыстоўваюцца, і пабудавана адпаведная дакладная сістэма работы мясцовых Саветаў дэпутатаў па перспектыўных напрамках устойлівага развіцця падведамаснай тэрыторыі.

### З людзьмі — напрамую

***— Наколькі, на Ваш погляд, мэтазгодна падключэнне заканадаўчай улады на месцах не толькі да ўвасаблення законаў у жыццё, але і да абмеркавання асабліва сацыяльна значных законапраектаў на этапе іх падрыхтоўкі?***

— Неабходна адзначыць, што ў любым дэмакратычным грамадстве заканадаўчая дзейнасць ажыццяўляецца з улікам грамадскай думкі. Англійскі філосаф Джон Сцюарт Міль лічыў юрыдычныя законы «штучнымі сацыяльнымі ўмовамі», якія вызначаюцца нацыянальным характарам, думкамі, «адчуваннямі», норамамі народа.

У сувязі з гэтым важнымі складнікамі работы над законапраектам з'яўляюцца прагназаванне наступстваў прыняцця закона, а таксама вывучэнне адносін грамадскасці і суб'ектаў гаспадарання да яго палажэнняў. Для ўліку рэальных патрэб грамадства і суб'ектаў гаспадарання, больш даступнага і зразумелага выкладу нормаў, што рэгулююць пэўную сферу грамадскіх адносін, праекты законаў, якія знаходзяцца на разглядзе ў парламенце, павінны шырока абмяркоўвацца з кіраўніцтвам прадпрыемстваў, працоўнымі калектывамі і насельніцтвам. Уключэнне грамадскай думкі ў практыку распрацоўкі і прыняцця законапраектаў, рэалізацыі прававых рашэнняў — адна з асноўных умоў павышэння аўтарытэту членаў Савета Рэспублікі і дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў сярод насельніцтва, што ставрае аб'ектыўную сітуацыю для росту прававой актыўнасці людзей, уцягвання іх у заканатворчую дзейнасць па фарміраванні закона са зместоўнага боку, а ў канчатковым выніку — стварэння дзейсных законаў.

Пры рабоце над праектам павінны быць задзейнічаны веды парламентарыяў, іх жыццёвы вопыт, інтуіцыя, а таксама пазіцыі і рэкамендацыі не толькі навукоўцаў-юрыстаў, экспертаў, але і мясцовых органаў улады, тых, хто ўвасабляе законы ў жыццё. Заканадаўцу неабходны дакладныя веды аб аб'ектыўных патрэбах грамадства.

# Бачыць і прыводзіць у дзеянне мясцовыя магчымасці і рэсурсы

## Каб жыццё людзей у рэгіёнах станавілася лепшым

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА ў гутарцы з нашым карэспандэнтам падзяліўся сваімі думкамі пра некаторыя кірункі работы дэпутатаў парламента ў выбарчых акругах.**



Фота БЕЛТА.

***— Уладзімір Паўлавіч, якая роля сучаснага дэпутата Палаты прадстаўнікоў у выбарчай акрузе? Ці можна сказаць, што ён — сувязное звяно паміж уладай і людзьмі?***

— Дзейнасць дэпутатаў парламента ў рэгіёнах заўсёды была вельмі важнай і неабходнай людзям. Перакананы, што ва ўмовах цяперашняй рэчаіснасці і тых выклікаў, з якімі сутыкнулася наша краіна, актыўны дэпутацкі ўдзел у вырашэнні розных пытанняў і праблем сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў набывае асаблівае значэнне.

***— Чаму асабліва?***

— Таму што каму многае дадзена, з таго многае і патрабуецца ў яго дзейнасці па аказанні дапамогі выбарчым акругам. Найперш менавіта гэтага небеспадстаўна чакаюць людзі ад свайго дэпутата.

Я лічу вельмі важным, што хоць склад Палаты прадстаўнікоў пасля асенніх парламенцкіх выбараў істотна абнавіўся, дэпутацкі корпус без раскачкі ўключыўся ў заканатворчы працэс і ў работу ў выбарчых акругах. Плённа прайшла першая сесія, дэпутаты рэгулярна выязджаюць у акругі, праводзяць асабісты прыём выбаршчыкаў, сустрэчы ў працоўных калектывах, займаюцца вырашэннем канкрэтных пытанняў па вусных і пісьмовых зваротах людзей. Мы актыўна ўдзельнічалі ў навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці», якая традыцыйна праходзіць пад патранатам кіраўніка дзяржавы, і ў іншых мерапрыемствах, у тым ліку рэгіянальных. Цяпер ідзе падрыхтоўка да другой сесіі Палаты прадстаўнікоў.

***— Значыць, дэпутатам ужо ёсць пра што расказаць сваім выбаршчыкам?***

— Ёсць. У парламент абраныя тыя, каго на месцах добра ведаюць як прафесіяналаў і асоб, таму адаптацыя дэпутатаў да новай дзейнасці прайшла даволі арганічна.

Я думаю, калі парламентарый поўнасцю разумее высокую меру сваёй адказнасці перад выбаршчыкамі, грамадствам і дзяржавай, то ў яго справах усё атрымліваецца так, як і належыць. Тады ён не проста «сувязное звяно паміж уладай і людзьмі», але і сам з'яўляецца прадстаўніком дзяржаўнай улады і людзей, якія аказалі яму высокі давер, выбраўшы ў заканадаўчы і прадстаўнічы орган дзяржавы. Менавіта на такі падыход да выканання сваіх паўнамоцтваў і абавязкаў нацэліў парламентарыяў Прэзідэнт Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка напярэдадні пачатку работы новага Нацыянальнага сходу.

***— Якія набалелыя праблемы ў сваіх акругах змаглі вырашыць дэпутаты Палаты прадстаўнікоў у мінулым годзе?***

— Дэпутаты займаюцца шырокім колам праблем, якія клапоцяць рэгіёны, тэрыторыі, прадпрыемствы, арганізацыі і, вядома ж, канкрэтных людзей. Гэта вельмі карпатлівая, складаная праца, бо праблемы і пытанні бываюць вельмі няпростыя і неадназначныя. Зразумела, для іх вырашэння трэба дасканала ведаць сацыяльна-эканамічную сітуацыю на месцах, працаваць у цесным кантакце з распарадчымі і выканаўчымі органамі раёнаў, гарадоў і абласцей, з міністэрствамі і ведамствамі, што мы і робім. Звяртаемся па дапамогу, калі ўзнікае такая неабходнасць, і ва ўрад.

***— Што ўдаецца ў выніку?***

— Удаецца вырашаць нямала канкрэтных пытанняў. Яны звязаны з мадэрнізацыяй прадпрыемстваў, газіфікацыяй, водазабеспячэннем і добраўпарадкаваннем населеных пунктаў, наладжваннем нармальных транспартных зносін у глыбінцы. Вялікая ўвага ўдзяляецца вырашэнню пытанням занятасці і стварэння новых рабочых месцаў, дзяржаўна-прыватнаму партнёрству ў мэтах устойлівага развіцця сельскіх раёнаў.

***— А ў сацыяльнай сферы?***

— Хацеў бы падкрэсліць, што па добрай парламенцкай традыцыі прадметам асаблівага клопату дэпутацкага корпуса Палаты прадстаўнікоў з'яўляецца будаўніцтва, рэканструкцыя і рамонт устаноў адукацыі і выхавання, аховы здароўя, культуры. Адзначу таксама ўдзел дэпутатаў у арганізацыі дабрачынных акцый дапамогі сіротам, састарэлым, ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, інвалідам, дзецям са шматдзетных сем'яў і іншых сацыяльных праектаў, у тым ліку дапамогі выхаванцам дзіцячых дамоў сямейнага тыпу.

Актыўную дзелавую ролю дэпутатаў новага склікання ва ўсіх названых накірунках дзейнасці мы лічым вельмі запатрабаванай. З таго, як вырашаюцца, здавалася б, шараговыя праблемы тэрыторый і грамадзян, складваецца агульная карціна работы ўлады і стаўленне да яе людзей.

***— Як дэпутаты Палаты прадстаўнікоў працуюць са зваротамі да іх грамадзян і юрыдычных асоб?***

— Так, як і належыць у адпаведнасці з дзейным заканадаўствам. Па сутнасці кожнага пытання пасля яго вывучэння прымаюцца ўзважаныя рашэнні. Вынікі работы са зваротамі дэталёва аналізуюцца і кладуцца ў аснову прапаноў па ўдасканаленні заканадаўства, якое рэгулюе розныя сферы грамадскіх адносін.

***— Часам зварот выбаршчыка да дэпутата выліваецца ў заканадаўчую ініцыятыву. У чым сутнасць прапаноў, якія знізу паступілі ў Палату прадстаўнікоў за апошнія гады?***

— Нярэдка грамадзяне ставяць пытанні, якія патрабуюць прыняцця пэўных заканадаўчых рашэнняў. На гэтай аснове дэпутатамі пятага склікання было распрацавана сем законапраектаў. Шэсць з іх ужо сталі законамі, яшчэ адзін рыхтуецца да разгляду ў другім чытанні. Так, у шматлікіх зваротах людзі выказвалі сваю сур'ёзную заклапочанасць вырубкай дрэў і кустоў уздоўж дарог і ў некаторых іншых месцах. Гэта пацягнула распрацоўку і прыняцце адпаведных змяненняў і дапаўненняў у заканадаўства па пытаннях абыходжання з аб'ектамі расліннага свету. Зваротамі грамадзян былі выкліканы заканадаўчыя папраўкі аб аплаце жыллёва-камунальных паслуг, аб турыстычнай дзейнасці. Сёлета запланавана карэкціроўка нарматыўна-прававой базы па пытаннях медыяцыі, прыватызацыі і інвестыцыйнай дзейнасці.

Вынікам сур'ёзнай работы са зваротамі з'яўляюцца таксама шматлікія дэпутацкія папраўкі ў законапраекты, прапановы ўраду і звароты Палаты прадстаўнікоў у Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь. З улікам прапаноў выбаршчыкаў удасканалены законы аб барацьбе з карупцыяй, абароне правоў спажыўцоў, ахове працы, аб асновах адміністрацыйных працэдур, аб пенсійным забеспячэнні, Падатковы кодэкс і іншыя заканадаўчыя акты. Нагадаю, што адказнасць за кіраванне транспартным сродкам у стане алкагольнага ап'янення і за распаўсюджванне наркотыкаў была заканадаўча ўзмоцнена менавіта па прапановах грамадскасці.

Падтрымаўшы ініцыятыву грамадзян, у 2014 годзе Палата прадстаўнікоў звярнулася ў Канстытуцыйны Суд з прапановай праверыць канстытуцыйнасць асобных палажэнняў Крымінальна-працэсуальнага кодэкса па пытаннях вядзення па крымінальнай справе, што і было зроблена. Адпаведны законапраект па заключэнні Канстытуцыйнага Суда прыняты ўжо ў першым чытанні. На вясновай сесіі мы разгледзім яго ў другім чытанні.

***— Уладзімір Паўлавіч, Вы рэгулярна ездзіце ў сваю выбарчую акругу, якой аказваеце дапамогу ў вырашэнні самых розных пытанняў. Людзі гэта ведаюць і цэняць. Якое выказваце пажаданне рэгіёнам, зыходзячы з Вашага вялікага вопыту?***

— Кожны рэгіён мае свой адметны патэнцыял для сацыяльнага і эканамічнага развіцця. Важна, каб на месцах бачылі, знаходзілі і выкарыстоўвалі мясцовыя магчымасці і рэсурсы, а не чакалі, што дэпутат парламента і вышэйшае кіраўніцтва ўсё зробяць. Многае залежыць ад актыўнай пазіцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў. Лёс задач новага этапу сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны вырашаецца на месцах, у раёнах, рэгіянальных гарадах і абласцях. Вельмі важна, каб мясцовыя Саветы пастаянна працавалі з людзьмі, своечасова рэагавалі на праблемы, асабліва сацыяльнага плану, і больш смела шукалі шляхі іх вырашэння. Пад ляжачы камень вада не цячэ. Усім трэба дзейнічаць ініцыятыўна і супольна.

***— Нядаўна пасля асабістага прыёму грамадзян у Докшыцах Вы адзначылі ў каментарыі для прэсы, што спектр пытанняў у зваротах людзей да дэпутата ўжо не такі, як 10—15 гадоў таму. Яны хочуць жыць больш камфортна. Чым, на Вашу думку, гэта тлумачыцца?***

— Тлумачыцца тым, што як бы вострa мы ні крытыкавалі цяперашнія эканамічныя праблемы, якасць жыцця ў нашай краіне за два апошнія дзесяцігоддзі прыкметна палепшылася. Як у гарадах, так і ў сельскай мясцовасці. Аднак чалавеку заўсёды хочацца большага. Толькі не ўсе разумеюць, што для гэтага кожнаму працаваць трэба больш. Не толькі ў прамым сэнсе — на сваім рабочым месцы, але і над сваімі жаданнямі. Каб яны не трансфармаваліся ва ўнутраную перакананасць, што ўсё павінна зрабіць дзяржава і ўсё для сябе можна зрабіць за кошт дзяржавы. Такія спажывецкія настроі не могуць не насцярожваць дэпутатаў мясцовых Саветаў і нас, парламентарыяў.

Я думаю, што правядзенне чарговага пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання вельмі дарэчы для таго, каб гэта ўзаемадзеянне развівалася ў больш эфектыўнай практычнай плоскасці, карыснай развіццю мясцовага самакіравання ў рэчышчы надзённых грамадскіх і нашых агульнадзяржаўных задач.

### ПРОСТАЯ МОВА



Фота БЕЛТА.

**Ігар ЖУК, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі:**

— Асноўны кірунак дзейнасці Савета па ўзаемадзеянні — гэта каардынацыя работы мясцовых органаў самакіравання. Выязное пасяджэнне на базе Лідскага раёна Гродзенскай вобласці мае на мэце паказаць, наколькі дакладна, скаардынавана гэтыя органы працуюць, выконваюць Закон «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» і вырашаюць тыя найважнейшыя задачы, што былі пастаўлены на V Усебеларускім народным сходзе. Мы вывучым, якая ідзе ў гэтым кірунку работа, пачынаючы з першаснага звяна: як працуюць сельскія Саветы, гарадскі Бярозаўскі, Лідскі раённы і Гродзенскі абласны Саветы дэпутатаў па рашэнні пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны і праблемных момантаў жыццезабеспячэння насельніцтва.

Падчас візіту мы асаблівa будзем звяртаць увагу на сельскагаспадарчую галіну, а таксама на развіццё прамысловасці. У той жа час Ліда — гэта 100-тысячны горад, у якім рэалізуецца шэраг маштабных інвестыцыйных праектаў. Таму наша задача — ацаніць, наколькі выкарыстоўваецца інавацыйны патэнцыял раёна. Так, на прыкладзе Мінойтаўскага рамонтнага завода, што спецыялізуецца на сельгастэхніцы, убачым, што нават у сучасных, не заўжды спрыяльных эканамічных умовах, калі ёсць таленавіты кіраўнік і за яго плячыма стаіць гатовы да працы калектыў, можна выпрабляць добрую прадукцыю і паспяхова яе прадаваць. Акрамя таго, Савет наведае шклозавод «Нёман», кампанію па вытворчасці прадукцыі з мяса індычкі «Арвібелагра», Лідскі ветсанутыльзавод, а таксама прадпрыемства «Бел-Пласт Інтэрнэшнл».

Мы збіраемся прааналізаваць, наколькі эфектыўна працуюць мясцовыя органы ўлады, наколькі садзейнічаюць прыцягненню інвестыцый, стварэнню новых працоўных месцаў, развіццю экспарту, малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, эфектыўнаму выкарыстанню дзяржаўнай маёмасці. Удзелім увагу таму, ад чаго залежыць стан усяго рэгіёна: як фарміруецца бюджэт вобласці і раёна, ці ёсць дынаміка росту падаткаабкладаемай базы і за кошт чаго? Таксама звернемся да іншых паступленняў — сферы дзейнасці мясцовых органаў самакіравання: рэалізацыі зямельных участкаў, продажу, здачы ў арэнду дзяржмаёмасці. І, вядома, да тэмы, нядаўна агучанай Прэзідэнтам, — развіцця аграгарадкоў.

# ГАЛОЎНЫ КРЫТЭРЫЙ — ДАБРАБЫТ ЛЮДЗЕЙ

## Дэпутаты мясцовых Саветаў павінны ўласным прыкладам дэманстраваць добрасумленнае стаўленне да справы

**Мясцовае самакіраванне з'яўляецца адным з найважнейшых складнікаў у сістэме беларускай дзяржаўнасці. Яно прайшло вызначаны этап фарміравання, паказала сваю эфектыўнасць і неабходнасць перш за ўсё для нашых людзей. Менавіта мясцовыя органы, цесна кантактуючыя з насельніцтвам, найбольш зацікаўленыя ў вырашэнні рэгіянальных праблем і задавальненні патрэб людзей. Гэта ўлада, найбольш набліжаная да людзей і занятая перш за ўсё вырашэннем іх паўсядзённых, самых неадкладных праблем. І па тым, наколькі эфектыўна яна кіруе падведамаснай тэрыторыяй, людзі мяркуюць пра ўладу ў цэлым. Аб рабоце органаў мясцовага самакіравання, аб іх свайго роду ўнікальнасці і месцы ў сістэме беларускай дзяржаўнасці мы пагаварылі са старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандрам ПАПКОВЫМ.**



Фота Аксаны МАНЧУК.

***— Аляксандр Андрэевіч, чым, на Ваш погляд, сёння найперш павінны займацца Саветы дэпутатаў на месцах? Якія галоўныя накірункі іх работы Вы б адзначылі?***

— Перш за ўсё, мясцовае самакіраванне адказвае за вырашэнне сацыяльных пытанняў насельніцтва. Гэта адукацыя, ахова здароўя, прадастаўленне паслуг ЖКГ, добраўпарадкаванне гарадоў і пасёлкаў і іншыя найважнейшыя пытанні якасці жыцця, асабліва ў вёсцы. Таксама рэалізуюцца важнейшыя дзяржаўныя праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, падтрымка прадпрымальніцтва, вырашаюцца праблемы забеспячэння занятасці. А зараз гэта найбольш важна і найбольш актуальна.

Дэпутаты павінны быць актыўнымі людзьмі, праводзіць арганізацыйна-масавую і тлумачальную працу з насельніцтвам па пытаннях рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі на месцах. Бо эфектыўнасць мясцовага самакіравання шмат у чым залежыць не толькі ад наяўнасці неабходных законаў, якія забяспечваюць прававую, арганізацыйную і эканамічную аснову самакіравання, але і ад разумення насельніцтвам сваіх правоў і абавязкаў. Задача дэпутата — арганізаваць людзей, растлумачыць ім іх абавязкі, бо, на жаль, некаторыя людзі прывыклі да ўтрыманства, яны нярэдка лічаць, што мясцовай уладзе трэба за іх вырашаць нават іх бытавыя пытанні. Дэпутат павінен умець слухаць, пераконваць выбаршчыкаў, гэта значыць, павінна быць зваротная сувязь паміж выбаршчыкам і канкрэтным дэпутатам. Гэта дазволіць своечасова рэагаваць і вырашаць вострыя пытанні, а галоўнае — пазітыўна адаб'ецца на ўзроўні і якасці жыцця людзей.

***— Якія крытэрыі ацэнкі дэпутацкай дзейнасці?***

— Узровень развіцця рэгіёна, яго адпаведнасць новым патрабаванням, дабрабыт людзей, іх сацыяльнае самаадчуванне.

Праблема ацэнкі эфектыўнасці работы органаў мясцовага самакіравання адносіцца да ліку найменш прапрацаваных у тэорыі і на практыцы. Але мы над гэтым цяпер працуем.

На маю думку, дзейнасць мясцовых Саветаў дэпутатаў павінна ацэньвацца зыходзячы з рашэння наступных асноўных задач на месцах: рашэнне пытанняў устойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця падведамаснай тэрыторыі, уключаючы пытанні занятасці насельніцтва, экспарту, прыцягненне інвестыцый у свой рэгіён, развіццё малога і сярэдняга прадпрымальніцтва; узровень падрыхтоўкі і правядзення сесій, актуальнасць пытанняў, якія абмяркоўваюцца, і дзейснасць рашэнняў, што прымаюцца; дакладнай і зладжанай работы ўстаноў сацыяльнай сферы, якасці аказання паслуг насельніцтву; паслядоўнага вырашэння пытанняў добраўпарадкавання населеных пунктаў; эфектыўнай работы органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання; інфармавання насельніцтва аб важнейшых падзеях, якія адбываюцца як у асобных рэгіёнах, так і ў краіне, і задачах, якія стаяць перад грамадствам.

***— Ці цалкам сёння выкарыстоўваецца дэпутацкі патэнцыял, правы і паўнамоцтвы дэпутэтаў? Ці пазбавіліся мы ад фармалізму ў гэтай сферы? Чым звычайны дэпутат можа дапамагчы свайму выбаршчыку?***

— На мой погляд, яшчэ некалькі гадоў таму статус і аўтарытэт мясцовай прадстаўнічай улады быў, мякка кажучы, невысокі. Калі казаць пра выканаўчую ўладу, то тут выбудавана жорсткая вертыкаль, і сістэма зладжана працуе. А вось прадстаўнічыя органы ўлады на месцах засталіся некалькі адарванымі ад гэтай канструкцыі і дзесьці нават бездапаможныя.

За апошнія 10 гадоў прыняты шэраг нарматыўных прававых актаў, якія далі магчымасць павысіць ролю органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва, істотна ўмацаваць матэрыяльна-тэхнічную і прававую базу Саветаў дэпутатаў.

Лічу, што паўнамоцтваў у дэпутацкага корпуса мясцовых Саветаў дастаткова. Існуючая заканадаўчая база дае вялікія магчымасці для іх эфектыўнай дзейнасці. Гэта — удзел у рабоце сесій Савета, пасяджэннях яго органаў, дэпутацкіх груп, аб'яднанняў, запыты, звароты, удзел у праверках дзяржаўных і іншых арганізацый, унясенне прапаноў аб ліквідацыі парушэнняў заканнасці. Пытанне заключаецца толькі ў меры выкарыстання дадзеных паўнамоцтваў і сумленным стаўленні да выканання сваіх дэпутацкіх абавязкаў.

***— Пастаянная камісія, якую Вы ўзначальваеце, фактычна каардынуе сувязь Савета Рэспублікі з дэпутатамі ўсіх узроўняў. Ці можна сёння сказаць, што яна зваротная, што дэпутаты «знізу», з месцаў, актыўна сябе праяўляюць?***

— Перад Пастаяннай камісіяй па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні ставіцца шмат пытанняў. У прыватнасці, гэта пытанні адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання дзяржавы, мясцовага самакіравання, аграрнай палітыкі, прыродакарыстання і аховы навакольнага асяроддзя, транспарту, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, гандлю. Па сутнасці, рэгіянальная палітыка ахоплівае ўсе найважнейшыя галіны матэрыяльнай вытворчасці, а таксама занятасці насельніцтва, размяшчэнне сферы абслугоўвання, стымуляванне турызму... Я магу сказаць так: рэгіянальная палітыка мае на ўвазе прыняцце такіх кіраўніцкіх рашэнняў, якія б прынеслі эканамічны росквіт самым далёкім куткам нашай краіны, і кожны чалавек, дзе б ён ні жыў, меў бы магчымасць рэалізаваць свой патэнцыял.

Адным з асноўных і актуальных напрамкаў практычнай дзейнасці Савета Рэспублікі як палаты тэрытарыяльнага прадстаўніцтва з'яўляецца канструктыўнае супрацоўніцтва з мясцовымі органамі ўлады і праца ў рэгіёнах. Хочацца адзначыць, што 23 члены Савета Рэспублікі з'яўляюцца дэпутатамі мясцовых Саветаў дэпутатаў 27-га склікання, у тым ліку 15 — дэпутаты абласных Саветаў дэпутатаў, 9 — раённых і гарадскіх, 4 — сельскіх Саветаў дэпутатаў. У Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні 4 члены камісіі з'яўляюцца дэпутатамі абласных, раённых і сельскіх Саветаў дэпутатаў. Думаю, што такое прадстаўніцтва сенатараў у органах мясцовага самакіравання дазволіць выбудаваць больш дакладную сістэмную работу па вывучэнні і абагульненні праблем насельніцтва і фарміраванні на гэтай аснове больш якаснай нарматыўна-прававой базы, яе сістэматызацыі і збалансаванасці на мясцовым узроўні.

Для эфектыўнага вырашэння мясцовымі органамі ўлады задач сацыяльна-эканамічнага развіцця падведамасных тэрыторый важна палепшыць сістэмны аналіз праблем, якія ўзнімаюцца на сесіях, пасяджэннях выканкамаў, а таксама на сходах грамадзян і ў працоўных калектывах. У сувязі з гэтым варта ўдасканальваць механізм і каналы інфармавання дэпутатамі мясцовых Саветаў дэпутатаў членаў Савета Рэспублікі і дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, рэспубліканскія і абласныя органы выканаўчай улады аб «балючых пытаннях», якія хвалююць насельніцтва.

Вялікую ролю ў гэтым працэсе павінны адыграць і дэпутаты Саветаў пярвічнага тэрытарыяльнага ўзроўню. Яны стаяць на «передавым рубяжы» і павінны дайсці да кожнага грамадзяніна, сям'і, вызначыць найбольш вострыя праблемы, запыты людзей, якія пражываюць на выбарчым участку.

***— Ці прэстыжна сёння працаваць у сельскіх, раённых Саветах дэпутатаў? Што патрэбна для ўмацавання іх аўтарытэту сярод насельніцтва?***

— Што мы разумеем пад прэстыжнасцю работы? Гэта грамадская ацэнка значнасці, прывабнасці пэўнага роду заняткаў. Прэстыж — гэта павага статусу, якая склалася ў грамадскай думцы.

Работа ў органах мясцовага самакіравання — цяжкая, але, я лічу, і прэстыжная. Гэта свайго роду школа, якая фарміруе ключавыя кампетэнцыі пачынаючага кіраўніка, палітыка: здольнасць вырашаць шырокае кола пытанняў, якія датычацца сацыяльна-эканамічнага развіцця падведамаснай тэрыторыі, паўсядзённых праблем насельніцтва, уменне дамаўляцца з рознымі сацыяльнымі і прафесійнымі групамі, зразумела даносіць свае ідэі да людзей, абараняць правы і інтарэсы выбаршчыкаў. Лічу, што «прафесійную загартоўку» палітыкі, дзяржаўныя служачыя, кіраўнікі арганізацый павінны атрымліваць менавіта ў сістэме мясцовага самакіравання.

Кіраўнікі мясцовых органаў улады павінны быць гаспадарамі на падведамаснай тэрыторыі, дакладна ведаць становішча спраў і аператыўна вырашаць усе наяўныя праблемы, працаваць на апярэджанне. Ім неабходна вырашаць шырокае кола пытанняў: фарміраваць мясцовыя бюджэты, планаваць сацыяльна-эканамічнае развіццё падведамаснай тэрыторыі, вырашаць многія іншыя жыццёва неабходныя пытанні. Важкую дапамогу ў гэтым могуць аказаць кіраўнікі арганізацый і прадпрыемстваў. Так, напрыклад у Гомельскай і Мінскай абласцях прынята практыка правядзення рэгулярных пленарных нарад у старшыні сельсавета, у якіх прымаюць удзел усе кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, што працуюць на адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы, незалежна ад формы ўласнасці. Безумоўна, такая форма работы дазваляе абмеркаваць існуючыя цяжкасці і знайсці шляхі для іх пераадолення. На мой погляд, толькі надзейная каманда аднадумцаў можа забяспечыць рэалізацыю пастаўленых задач.

***— Ці чакаюць гэтую сферу у бліжэйшыя гады нейкія рэформы?***

— Дадзенае пытанне неаднаразова разглядалася і вывучалася з прыцягненнем шырокага кола навукоўцаў органаў дзяржаўнага кіравання, парламентарыяў, мясцовых Саветаў дэпутатаў і насельніцтва. Было адзначана, што дзеючая ў цяперашні час сістэма мясцовага кіравання і самакіравання ў краіне ў асноўным адпавядае грамадска-палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сітуацыі і ў якім-небудзь кардынальным удасканаленні не мае патрэбы. Тым не менш, з улікам пастаўленых кіраўніком дзяржавы новых, маштабных задач па павышэнні ўзроўню жыцця народа, у працы гэтай сістэмы апраўдана правесці шэраг паляпшэнняў, якія павінны насіць узважаны і паслядоўны характар.

У цяперашні час у Савеце Рэспублікі створана рабочая група, якая ўсебакова вывучыла становішча спраў на месцах, праблемныя пытанні работы органаў мясцовага самакіравання і ўнесла адпаведныя прапановы па ўдасканаленні працы названых органаў, якія будуць дэталёва разгледжаны ў Савеце Рэспублікі.

***— Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі дзейнічае ўжо дзясяты год. За гэты час якія новыя прыярытэты з'явіліся ў справе каардынацыі дзейнасці мясцовых Саветаў дэпутатаў?***

— Стварэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання прыкметна і адчувальна зблізіла нас з органамі ўлады на месцах і дапамагае каардынаваць нашы дзеянні ў адзіным кірунку, выпрацоўваць сістэму ўзаемаадносін з органамі дзяржаўнага кіравання, актывізаваць працу мясцовых Саветаў па рашэнні пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця падведамасных тэрыторый, а галоўнае — уплываць на працэс удасканалення заканадаўства.

Ці апраўдаў сябе Савет па ўзаемадзеянні? Гэта пытанне, вядома, лепш задаць старшыням мясцовых Саветаў дэпутатаў. Аднак скажу, што Саветы атрымалі рэальную магчымасць абмяркоўваць свае праблемы, выносіць іх на дзяржаўны ўзровень, абменьвацца думкамі.

Вядома, гэта сур'ёзная і вялікая работа патрабуе свайго далейшага ўдасканалення.

Падводзячы вынікі сказанаму, хачу адзначыць, што мы можам прылічыць мясцовае самакіраванне да тых рэсурсаў, на якія трэба рабіць стаўку, вырашаючы задачу стварэння новых механізмаў унутранай інтэграцыі і сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі. Асаблівая каштоўнасць гэтага рэсурсу ў тым, што ён з'яўляецца надзвычай дынамічным і валодае тэндэнцыяй да паскоранага самаразвіцця.

# Леанід ЦУПРЫК: «УЗМАЦНЕННЕ МЯСЦОВАГА САМАКІРАВАННЯ — НЕАДКЛАДНАЯ ЗАДАЧА ДЗЯРЖАВЫ»


Фота БЕЛТА.

**Ці трэба чакаць змен у заканадаўстве, што рэгулюе працу органаў мясцовага кіравання і самакіравання? Як рэальна можа дапамагчы сваім выбаршчыкам дэпутат Палаты прадстаўнікоў? Ад чаго залежыць эфектыўнасць працы мясцовай улады? Пра гэта «МС» расказаў Леанід ЦУПРЫК, старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.**

***— Як бы Вы вызначылі ролю мясцовага самакіравання, мясцовых дэпутатаў у дзяржаўным будаўніцтве?***

— Вядома, што мясцовае самакіраванне — неад'емная частка грамадзянскай супольнасці. Яно ўяўляе сабой найважнейшую форму народаўладдзя, непасрэдна выражае волю народа і з'яўляецца адной з асноў дэмакратычнай дзяржавы. На мой погляд, мясцовае самакіраванне — адна з форм арганізацыі мясцовага дзяржаўнага кіравання. Мясцовая ўлада максімальна набліжана да насельніцтва, закранае інтарэсы кожнага чалавека, вырашае большасць яго надзённых праблем.

Органы мясцовай улады павінны іграць значную ролю ў сучасным грамадстве. На гэтым пастаянна акцэнтуе ўвагу Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь у сваіх выступленнях, пасланнях беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь. На маю думку, узмацненне значнасці мясцовага самакіравання з'яўляецца адной з неадкладных задач сучаснай дзяржавы.

***— Над чым працуе ваша камісія — у плане ўдасканалення заканадаўства ў сферы мясцовага самакіравання?***

— Сёлета Пастаянная камісія па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце плануе ўдзельнічаць у падрыхтоўцы і правядзенні парламенцкіх слуханняў, па пытаннях дзейнасці органаў мясцовага самакіравання, якія праводзяцца Палатай прадстаўнікоў. Акрамя таго, запланавана правядзенне некалькіх выязных пасяджэнняў Пастаяннай камісіі па гэтай тэме.

Варта адзначыць, што з прыняццем Закона Рэспублікі Беларусь «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь» зроблены сур'ёзны крок у бок еўрапейскіх стандартаў. Гэты Закон адказвае патрабаванням сённяшняга дня, адкрываючы пры гэтым вялікія перспектывы, асабліва ў плане работы мясцовай улады з насельніцтвам. Ён сістэматызуе і комплексна рэгулюе грамадскія адносіны ў галіне мясцовага кіравання і самакіравання. Змяненні і дапаўненні ў гэты закон уносіцца перыядычна. Толькі за час, які прайшоў з моманту яго падпісання, навацыі прымаліся сем разоў.

Сённяшнія працэсы развіцця нашага грамадства патрабуюць пашырэння актыўнасці людзей у вырашэнні пытанняў мясцовага жыцця. Адпаведна гэтаму павінны садзейнічаць прававыя і арганізацыйныя высновы заканадаўства. Наша Пастаянная камісія, аснову якой складаюць дэпутаты-практыкі мясцовага кіравання і самакіравання, удзяляе значную ўвагу напрацоўцы варыянтаў заканадаўчых ініцыятыў па павышэнні эфектыўнасці мясцовага самакіравання.

***— На якім узроўні цяпер знаходзіцца якасць паслуг насельніцтву ў розных сферах жыццядзейнасці?***

— Эфектыўнасць работы органаў мясцовага кіравання і самакіравання залежыць ад выбранай мадэлі кіравання, дастатковасці фінансавання для выканання сваіх функцый, развітасці формаў непасрэднага ажыццяўлення насельніцтвам мясцовага самакіравання, адказнасці органаў мясцовага кіравання і самакіравання перад насельніцтвам, а таксама актыўнасці насельніцтва, якое ажыццяўляе мясцовае самакіраванне.

У нас у краіне ідзе пастаянная работа над павышэннем якасці і забеспячэннем паўнаты паслуг, якія аказваюцца ўладай усіх узроўняў і іншымі арганізацыямі ў розных сферах. Ствараюцца такія ўмовы, пры якіх грамадзяне і прадстаўнікі юрыдычных асоб не будуць марнаваць час і сілы пры звароце ў дзяржаўныя органы і арганізацыі, якія аказваюць паслугі і забяспечваюць жыццядзейнасць насельніцтва. Узровень паслуг адпавядае ўзроўню развіцця канкрэтнай адказнай галіны і яе ўстаноў, іх магчымасцям, а таксама залежыць ад узроўню кваліфікацыі кадраў, у тым ліку кіруючых. Тыя паслугі, якія непасрэдна аказваюць органы мясцовага кіравання і самакіравання, у значнай частцы рэгламентаваны адміністрацыйнымі працэдурамі сістэмы «Адно акно».

***— Якая, на Вашу думку, роля дэпутата Палаты прадстаўнікоў у вырашэнні праблем сваёй акругі? Што рэальна ён можа зрабіць?***

— Паўнамоцтвы дэпутата немалыя, ён упаўнаважаны праводзіць сходы выбаршчыкаў акругі, насельніцтва адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, сустрэчы з калектывамі работнікаў. Дэпутат таксама ўдзельнічае ў пасяджэннях органаў мясцовага кіравання і самакіравання. Бясспрэчна, без узаемадзеяння з мясцовымі органамі ўлады дэпутацкая дзейнасць была б значна больш складанай.

Хачу адзначыць, што ў праблемах выбарчай акругі добра разбіраюцца мясцовыя ўлады. І па большай частцы яны ўлічваюцца ў праграмах сацыяльна-эканамічнага развіцця тэрыторый. Але ёсць група пытанняў у грамадзян, калі яны хацелі б паскорыць тэрмін выканання работ, ёсць частка пытанняў, што маюць чыста арганізацыйны характар, ёсць скаргі на якасць паслуг...

На мой погляд, трэба больш увагі ўдзяляць інфармаванню людзей аб тым, дзе і кім павінны вырашацца іх пытанні, асабліва тыя, што падпадаюць пад юрысдыкцыю Грамадзянскага кодэкса. Часта людзі прыходзяць да дэпутата з крыўдамі і скаргамі, якія, акрамя судовых органаў, ніхто не мае права разглядаць.

У сваёй выбарчай акрузе падчас работы з насельніцтвам тлумачу найбольш значныя нарматыўна-прававыя акты і, у сваю чаргу, маючы зносіны з выбаршчыкамі, атрымліваю новыя заканадаўчыя ініцыятывы.

# АД ПОШУКУ ПРАЦЫ ДА ЧЫСЦІНІ ПАВЕТРА

## Жыхары Бярозаўкі прыходзяць да старшыні Бярозаўскага гарадскога Савета дэпутатаў Валерыя ЯВОДЗІКА нават з асабістымі праблемамі

**Разам з вырашэннем гарадскіх пытанняў Валерый Анатолевіч часам разбіраецца і ў суседскіх канфліктах. Летась да яго звярнулася больш за 60 гараджан. І гэта толькі афіцыйна — пісьмова ці прыйшлі на прыём. Але многія тэлефануюць ці спыняюць на вуліцы. «З імі таксама працуем, — гаворыць старшыня. — Тое, што вырашаецца, адразу робім. Да астатніх праблем падключаем патрэбныя службы». Мы прыйшлі да Валерыя Яводзіка ў дзень прыёму, каб пагаварыць пра будзённыя справы гарсавета.**



Валерый Анатолевіч працуе старшынёй ужо 11 гадоў. Ён гаворыць, што цяпер колькасць зваротаў значна зменшылася, бо з 2006 па 2010 год Бярозаўка ўдзельнічала ў Праграме развіцця малых гарадоў. У той час было зроблена шмат па добраўпарадкаванні і развіцці сацыяльнай сферы. цяпер дасягненні падтрымліваюцца, а праца працягваецца.

Сам старшыня з Навагрудчыны, але ў Бярозаўцы жыве ўжо больш за 20 гадоў. «Я адвучыўся ў Гродзенскім універсітэце і прыехаў на працу ў школу па месцы жыхарства жонкі. Потым стаў першым сакратаром гаркама Беларускага патрыятычнага саюза моладзі, а пасля прыйшоў працаваць у мясцовы выканкам». Валерый Анатолевіч лічыць, што сумяшчэнне пасад старшыні Савета і выканкама на пярвічным узроўні — гэта практычна. Мэты і задачы ідэнтычныя: забеспячэнне жыццядзейнасці. «Хто называе мяне старшынёй гарадскога Савета, хто — гарвыканкама. Галоўнае — дапамагчы чалавеку, а хто дапамагае — старшыня гарвыканкама або Савета — няма розніцы».

Летась адной з істотных праблем для грамадзян стала чысціня паветра. Новая вытворчасць — шклаваты — пагоршыла экалагічную сітуацыю ў горадзе. Але гэтая праблема была вырашана — сёння сістэма газаачысткі працуе на поўную магутнасць.

> Усе прамысловыя базы, акрамя шклозавода, аддадзены ў прыватныя рукі — развіваюцца, аказваюць паслугі насельніцтву.

— У мінулым годзе вырашылася праблема з кварталам індывідуальнай жылой забудовы, — расказвае Валерый Яводзік. — На працягу пяці гадоў мы выдзялялі ўчасткі на дзвюх вуліцах, але яны не былі да канца газіфікаваны. Атрымлівалі па гэтым пытанні звароты. Але месяц таму, у снежні, аб'ект быў здадзены — цэнтральны газапровад пракладзены. Цяпер афармляюцца дакументы, і прыкладна з лютага грамадзяне змогуць далучыцца да цэнтральнага газазабеспячэння.

Па жыллёва-камунальным напрамку людзей турбуюць добраўпарадкаванне тэрыторый, падсыпка дарог, вулічнае асвятленне. Ёсць звароты па графіку руху гарадскіх аўтобусаў. «У нас два рэйсы, і не ўсім падыходзіць час ад'езду. Калі ёсць магчымасць, карэктуем, калі не — тлумачым. Пад кожнага падстроіцца немагчыма, трэба ўлічваць многія фактары».

Ці не самая надзённая праблема — працаўладкаванне. У горадзе знаходзіцца адно буйное прадпрыемства — шклозавод «Нёман». Вакансіі ў сацыяльнай сферы запоўнены, вольных месцаў няма. Таму працу дапамагаюць шукаць не толькі ў Бярозаўцы, але і ў Лідзе, Навагрудку. Некаторыя самастойна з'язджаюць у Мінск, будаўнікі часам выбіраюць Расійскую Федэрацыю. Але чалавек хоча працаваць там, дзе ён жыве, таму найбольш ініцыятыўныя спрабуюць адкрыць прыватны бізнес. Па кансультацыю, як гэта зрабіць найлепш, таксама звяртаюцца ў гарадскі Савет. Па пэўных датах у горад прыязджаюць раённыя службы, напрыклад, супрацоўнікі цэнтра занятасці, каб грамадзяне маглі атрымаць параду або запоўніць дакументы.

Будынкі, якія маглі б быць задзейнічаны пад малы бізнес, у горадзе ўжо занятыя. Усе прамысловыя базы, акрамя шклозавода, аддадзены ў прыватныя рукі — развіваюцца, аказваюць паслугі насельніцтву. Напрыклад, па рамонце аўтамабіляў. СТА побач з аўтастанцыяй плануюць запусціць у 2017—2018-м. Гэта і магчымасць прайсці тэхагляд, і новыя працоўныя месцы. Адзін з развітых кірункаў — грузаперавозкі. Зарэгістравана некалькі малых прадпрыемстваў, машыны якіх курсіруюць па ўсёй Еўропе.

Адной з найбольш паспяховых ініцыятыў стала аграсядзіба «Над Нёманам». Яна пачала працаваць гадоў дзесяць таму і была адной з першых у краіне. Цяпер застаецца найлепшай у сваім напрамку. Яна прапаноўвае гасцям менавіта паслугі аграэкатурызму і працуе з пастаяннымі кліентамі. На выхадныя сюды прыязджаюць не толькі беларусы, але і расіяне, еўрапейцы і нават амерыканцы. Для іх арганізуюць спуск на плыце па Нёмане і больш традыцыйны адпачынак — рыбалку, збор грыбоў і ягад. Асноўная славутасць Бярозаўкі — хвоі. Прыезджыя называюць гэтыя мясціны маленькай Швейцарыяй. Шмат зяленіны, і зусім побач лес.

Акрамя гэтага, папулярны і прамысловы турызм. Дарэчы, у Гродзенскай вобласці толькі два прадпрыемствы, якія ім займаюцца, — шклозавод «Нёман» і «Лідскае піва». Штодня некалькі аўтобусаў прыязджаюць на экскурсію. У самога Валерыя Анатолевіча ў кабінеце таксама стаіць шкляны набор садавіны і гародніны, зроблены нёманскімі майстрамі.

Сёлета ў планах прадоўжыць капітальны рамонт жылфонду: абнавіць некалькі дамоў. У першую чаргу ідзе замена інжынерных сетак, а ў прыватным сектары працягваецца асфальтаванне вуліц. Жылля ў свой час у Бярозаўцы пабудавалі шмат, у тым ліку і дом для шматдзетных сем'яў і людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

# НА ХВАЛЯХ «НЁМАНА»

## Шклозавод горада Бярозаўка здзіўляе ўвесь свет новай прадукцыяй

**Адна з сённяшніх тэндэнцый — пакупнік становіцца больш капрызным, таму сёлета перад майстрамі стаіць задача выпускаць цікавую прадукцыю больш высокага цанавога сегмента, прывабную па дэкоры і ўпакоўцы. Гэтыя вырабы прэміум-класа пашыраць асартымент і, як плануецца, дазволяць выйсці на новыя рынкі. Чым сёння жыве завод, расказалі яго супрацоўнікі.**

### На ўсе густы

Як дызайнерскія вырабы ў адзенні, так і вырабы бярозаўскіх мастакоў — унікальныя і прыгожыя. Калекцыі са шкла будуць выходзіць абмежаванымі партыямі, гэта значыць, калі не паспеў заказаць калекцыю — разлічвай на вырабы тыражныя. «Мы размяжоўваем сегмент патокавай прадукцыі, разлічанай на штодзённае ўжыванне, і прадукцыі на ўзроўні высокамастацкіх вырабаў. Хочам разнастаіць работу майстроў і ў той жа час папесціць нашых пакупнікоў вытанчанымі рэчамі», — расказвае **намеснік дырэктара па рэалізацыі шклопрадукцыі Аксана АПАНАСЕНКА.**



Летась на заводзе адбыліся структурныя змены: асобна былі выдзелены службы маркетынгу і збыту. Маркетолагамі сталі найбольш вопытныя і крэатыўныя работнікі. Яны вывучаюць менталітэт і прыярытэты пакупнікоў тых рынкаў, куды плануецца наладзіць экспарт у найбліжэйшы час.

Аксана Апанасенка адзначае, што вялікую дапамогу ў прасоўванні прадукцыі аказваюць пасольствы Беларусі за мяжой. «Калі ў нас ёсць напрацоўкі з нейкімі кампаніямі, пасольствы могуць дапамагчы нам праверыць іх бізнес-рэпутацыю. Цяпер мы працуем з нашым пасольствам у Бразіліі, разлічваем, што сёлета правядзём прэзентацыю прадукцыі, на якую будуць запрошаны ўсе кампаніі, з якімі мы ўсталявалі сувязі ў 2016 годзе».

Цяпер супрацоўнікі рыхтуюцца паўдзельнічаць у выставе ў Франкфурце-на-Майне. Яна адна з самых маштабных у свеце ў галіне посуду і кухоннага начыння. «Для нас яна цікавая ў плане вывучэння становішча на рынку». Пастаянна прадукцыя «Нёмана» ўдзельнічае ў выставе HouseHold Expo ў Маскве. На ёй заключаецца каля трэці ўсіх дагавораў.

### Альтэрнатыўны варыянт!

Цяпер работа ідзе не толькі над формай, але і над якасцю. **Галоўны інжынер Юрый КІСЛЯК** расказвае, што асартымент пашыраецца і за кошт новых відаў шкла. «Нёман» правёў перагаворы з адной з нямецкіх кампаній, якая перадала тэхналогіі стварэння некалькіх доследных саставаў. На дадзены момант зварылі толькі адзін — гэта альтэрнатыўны варыянт крышталя. «Мы спадзяёмся перайсці ў новы сегмент продажу шклавырабаў, у тым ліку бессвінцовага крышталя, які больш запатрабаваны ў Заходняй Еўропе, Японіі і ЗША. Гэты састаў крыху таннейшы». Акрамя гэтага, перагаворы з кампаніямі, якія выпускаюць абсталяванне для частковай механізацыі, далі вынік: палепшылася якасць шкламасы і павысілася рэнтабельнасць продажаў. Найбольш адчувальнай навінкай мінулага года стаў запуск вырабу шклаваты:

— Да нас яе не выпускалі наогул. Ёсць некалькі заводаў у Расіі, якія цяпер з'яўляюцца нашымі канкурэнтамі. Гэта абсалютна новая вытворчасць, якая размясцілася на плошчах аднаго з законсерваваных цэхаў. Была праведзена рэабілітацыя будынка, бытавога корпуса, уцеплены фасад, адрамантаваны ўсе памяшканні.

### Творчым шляхам

Самі майстры да сваёй працы ставяцца творча. **Апрацоўшчык шклавырабаў Валянцін СЯНЬКО** працуе на заводзе з 1977 года. Пачынаў з дробязі — быў адношчыкам, наборшчыкам, выдзімальшчыкам — і дарос да брыгадзіра:

— Мы робім розны асартымент. Гэта майстэрства, якому вучышся гадамі. Я з Навагрудскага раёна, а тут, у Бярозаўцы, жыла мая радня. Яны неяк перацягнулі мяне, працаваць спадабалася — вось і застаўся. За час працы навучыў шмат маладых апрацоўшчыкаў і выдзімальшчыкаў. Мае сыны таксама некаторы час працавалі на заводзе, але па маім шляху не пайшлі.

Ёсць на прадпрыемстве дзве брыгады, якія асвойваюць новыя віды прадукцыі. Так, калі мастак стварае эскіз, ён прыходзіць да майстроў — і нараджаецца новы выраб. Часам спачатку трэба некалькі разоў патрэніравацца ці дапрацаваць кампазіцыю, каб выраб атрымаўся. Далей — ужо па адпрацаванай тэхналогіі — працягваюць вырабляць сувеніры іншыя брыгады. **Майстар-апрацоўшчык Валерый БАГІНСКІ**, які кіруе сваёй творчай брыгадай, расказвае пра сакрэты майстэрства:

— Калі вялікі вопыт за плячыма, з новымі прадуктамі не складана працаваць. Трэба проста мець мастацкую фантазію: бачыць перад сабой ужо гатовы прадукт. А прыёмы, якімі валодаеш, прыводзяць да добрага выніку. Чым больш навыкаў, тым вышэйшая якасць. Я ўжо 40 гадоў працую, бацька таксама быў з завода. Гэта наша дынастыя. У маіх дзвюх дачок таксама творчыя задаткі — малююць добра.

**Спецыяліст аддзела кадраў Тамара КЕНЦЬ** расказвае, што на заводзе вітаецца пераемнасць. Яе бацькі таксама тут працавалі, сын цяпер заняты ў шкляной прамысловасці, але ў Гродне. Тамара Кенць адзначае тэхналогіі, якімі ганарыцца «Нёман». Так, пасля вайны рабілі двухслаёвае накладное шкло: першы пласт — бясколерны, другі — каляровы. «Сёння мы спрабуем рабіць сіняе шкло разам з нямецкай кампаніяй. Аднаўляем гэту тэхналогію».


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

ПРОСТАЯ МОВА

**Міхаіл КАРПОВІЧ, старшыня Лідскага райвыканкама:**



— Лідскі раён з'яўляецца даволі прывабным для ўкладанняў. За мінулую пяцігодку сюды ўкладзена 107 мільёнаў долараў прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове, за 2016 год — каля 15 мільёнаў долараў. Гэта амаль чвэрць замежных інвестыцый, якія паступілі ў Гродзенскую вобласць.

На Лідчыне дзейнічае больш як 70 арганізацый з замежным капіталам, у тым ліку з удзелам расійскага, літоўскага, польскага, амерыканскага, нямецкага, дацкага, італьянскага і аўстрыйскага. Прыцягненню ў раён замежных інвестараў садзейнічае зручнае размяшчэнне Ліды на скрыжаванні важнейшых аўтамабільных дарог і чыгунак, багатыя зямельныя рэсурсы і кваліфікаваныя кадры. Рэгіён прываблівае і наяўнасцю развітой прамысловай інфраструктуры, створаным удзельнікам свабоднай эканамічнай зоны «Гроднаінвест».

Заканадаўчая база Беларусі ў сферы інвестыцый дазваляе паспяхова працаваць замежным партнёрам у нашай краіне, забяспечвае роўныя ўмовы для бізнесу, абараняе камерцыйныя інтарэсы інвестараў і прадастаўляе прэферэнцыі.

Але прыцягнуць інвестара не проста. Неабходна не толькі стварыць эканамічныя ўмовы, а і зацікавіць. Для гэтага мы праводзім рознага роду міжнародных форумы, арганізоўваем візіты дзелавых колаў, у тым ліку з удзелам дыппрадстаўніцтваў. Удзел прадстаўнікоў райвыканкама ў замежных мерапрыемствах, падчас якіх мы прэзентуем Лідскі раён, павышае яго імідж і вядомасць за мяжой.

Кожнаму інвестару мы аказваем усялякае садзейнічанне, кансультацыйную падтрымку і практычную дапамогу.

ЁСЦЬ ТАКІ ВОПЫТ

# ПАЎВЕКА ПРАЦЫ ДЛЯ ЗЯМЛІ

## Прадукцыю Мінойтаўскага рамонтнага завода пазнаюць... па характэрнай афарбоўцы

**Зялёна-чырвонымі плугамі трактары ўзворваюць як беларускія палі, так і стэпы Расіі ды Казахстана. Калі паўвека назад побач з горадам Ліда існавала звычайная трактарна-рамонтная станцыя, якая толькі абслугоўвала сельскагаспадарчую тэхніку, то сёння дачынае прадпрыемства Гродзенскага УП «Аблсельгастэхніка» само выпускае абсталяванне для работы на зямлі, прычым самага рознага прызначэння.**


Галоўны інжынер Мінойтаўскага рамонтнага завода Павел ЦЫБУЛЬСКІ.

Пасля таго як знік Савецкі саюз, многія прадпрыемствы трапілі ў складанае становішча, Мінойтаўскі завод не быў выключэннем. На той час тут займаліся толькі наладкай тэхнікі, але ў 2001 годзе попыт на рамонтныя паслугі зменшыўся, калгасы не былі зацікаўлены ў вялікай колькасці запчастак. Затое машын для апрацоўкі зямлі не хапала. Напрошвалася адзінае выйсце — прапанаваць раённым гаспадаркам тое, што іх зацікавіць.

Першыя плугі рабочыя майстравалі па чарцяжах навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі. Потым на заводзе ў Мінойтах узнікла ўласнае канструктарскае бюро.

Сёння на прадпрыемстве працуюць 189 работнікаў. У асноўным людзі жывуць у Мінойтах, каля 60 чалавек з Ліды і Бярозаўкі кожны дзень прыязджаюць сюды двума спецыяльнымі аўтобусамі. Дарэчы, у завода ёсць уласны інтэрнат.

— Мы невялікая арганізацыя, — кажа **галоўны інжынер Павел ЦЫБУЛЬСКІ**. — Раніцаю абыходзіш цэхі і адразу даведваешся, чым хто жыве, якія навіны. З некаторымі майстрамі я знаёмы не адзін год, калі раптам чалавек трапляе ў нейкае складанае становішча, то мы заўсёды гатовыя дапамагчы. Аднак да тых, хто парушае дысцыпліну, не працуе сам і перашкаджае іншым, выпівае, стаўлюся сурова. Магу нават звольніць.

У 2008—2009 гадах прадпрыемства сутыкнулася з чарговым выпрабаваннем: завод перастаў атрымліваць дзяржзаказ. Калі раней у Мінойтах кожны год выраблялі некалькі сотцень аднатыпных агрэгатаў, чый кошт аплачваўся загадзя, то цяпер завод павінен быў выжываць на кантрактах. Перыяд аказаўся нялёгкім. Часова знізіліся заробкі, і многія спецыялісты адправіліся шукаць «доўгі рубель». Аднак паступова з'явілася сетка дылераў у Расіі, Казахстане, Украіне, Літве... Сёння сярэдняя заработная плата ў цэху складае каля 670 рублёў, прыйшлі новыя людзі, на вакантныя працоўныя месцы нават утвараецца чарга. Дарэчы, як кажа Павел Цыбульскі, да маладых спецыялістаў тут ставяцца асабліва.

— Уяўленне, што на рамонтным заводзе рабочым трэба апрацоўваць дэталі ўручную, не зусім правільнае. Дэталі цяпер вырабляюць спецыяльныя механізмы, а апаратар толькі сочыць за працэсам і карэктуе яго на камп'ютары. Вельмі радасна, што выпускнікі тэхнічных універсітэтаў, якія прыходзяць да нас, ужо валодаюць мовай электроннага праграмавання.

— Маладым спецыялістам выплачваем пад'ёмныя, кожны год да дня сельскагаспадарчага работніка нашы завадчане атрымліваюць прэмію, — дадае **старшыня прафсаюзнага камітэта Таіса МАЦЭВІЧ**. — А паколькі мясцовасць у нас вясковая, дапамагаем сем'ям апрацоўваць палі тэхнікай, а пенсіянеры атрымліваюць участак зямлі, на якім могуць вырошчваць для сябе гародніну. У астатнім прапануем звычайную сацыяльную дапамогу: пуцёўкі ў санаторыі як дзецям, так і дарослым, бясплатную спецыяльную вопратку і сродкі засцярогі, ну і малако за шкоднасць. Яшчэ кожны год за кошт завода выклікаем медыцынскую камісію, правяраем стан здароўя работнікаў.

За апошнія пяць гадоў прадпрыемства «памаладзела» нават знешне: паступова ідзе рамонт заводскіх будынкаў. У цэхах цяпер пастаўлены новыя энергазберагальныя лямпачкі, заменена састарэлая сістэма вентыляцыі, куплены новыя станкі. У камеры для афарбоўкі агрэгатаў усталявана сістэма бяспекі з функцыяй GPS: у надзвычайнай сітуацыі прыбор не толькі папярэдзіць рабочых, але і адразу адправіць сігнал ратавальнікам. Аднак асаблівы гонар галоўнага інжынера — лямпы інфрачырвонага абагрэву.

— У нас вялізныя цэхі. Раней кацельня працавала на поўную сілу, аднак зімой у памяшканнях усё роўна было халаднавата. Дазнаўшыся пра цікавую тэхналогію, калі спецыяльныя лямпы пад столлю дадаткова награваюць тое месца, дзе працуе чалавек, вырашылі ўсталяваць навінку ў сябе — і сапраўды, своеасаблівая «зона цяпла» ратуе ў моцныя маразы.

Вядучы **інжынер-канструктар Леанід БІБЛІС** называе Мінойтаўскі рамонтны завод гарадаўтваральным прадпрыемствам. Для многіх мясцовых жыхароў гэта сапраўды так. За 50 гадоў тут паспелі ўтварыцца сапраўдныя сямейныя дынастыі, калі бацька перадае прафесію спачатку сыну, а той — свайму нашчадку. Не дзіва, што на заводскія святы рабочыя прыходзяць пакаленнямі.

УСЁ Ў КОМПЛЕКСЕ

# ЗАВАЯВАЦЬ... СТРАЎНІКІ БЕЛАРУСАЎ

**паспрабуюць літоўцы, якія неўзабаве будуць пастаўляць у нашы крамы якасную і здаровую прадукцыю з мяса індычкі**

**Пра тое, што пад Лідай у прамысловых мэтах будуць вырошчваць індыкоў, мясцовыя жыхары пачалі гаварыць не так даўно. А між іншым стварэнне вертыкальна інтэграванага комплексу па вытворчасці прадукцыі з мяса індычкі пачалося тры гады таму...**



Дырэктар кампаніі «АРВІБЕЛАГРА» Арунас БЕРНАДЗІШУС.

Праект літоўскай кампаніі «АРВІБЕЛАГРА» з'яўляецца значным як для Лідскага раёна і Гродзенскай вобласці, так і ўвогуле для краіны. Невыпадкова ён уключаны ў Дзяржаўную інавацыйную праграму Рэспублікі Беларусь.

У вертыкальна інтэграваны комплекс уваходзяць завод па вытворчасці камбікармоў, фермы па вырошчванні індыкоў, а таксама завод па забоі і перапрацоўцы мяса індычкі. Біялагічныя адходы ад птушкі будуць перапрацоўвацца на адным з заводаў — засавальнікаў «АРВІБЕЛАГРА».

## Падобнага яшчэ не было

У прыватнасці, дагэтуль мяса індычкі ў Гродзенскай вобласці выраблялі толькі ў Астравецкім раёне, дзе фермерская гаспадарка штогод стварае 1300 тон індычыны. У планах «АРВІБЕЛАГРА» — 5500 тон дыетычнага мяса ў год.

— Па вытворчасці мяса індычкі на душу насельніцтва Беларусь значна адстае ад многіх іншых краін, — гаворыць **дырэктар кампаніі «АРВІБЕЛАГРА» Арунас БЕРНАДЗІШУС.** — Сёння на аднаго беларуса выпрабляецца каля 200 грамаў індычыны. Столькі ж дыетычнага мяса на душу насельніцтва ў год мела Літва ў 2004-м, цяпер — каля 3 кілаграмаў. За 12 гадоў — рост у 15 разоў! У Еўропе гэтая лічба яшчэ большая: каля 5 кілаграмаў.

Навізна эканамічнага кірунку ў першую чаргу і прывабіла літоўскага інвестара ствараць падобнае прадпрыемства менавіта ў нашай краіне. Лідскі рэгіён прыцягнуў сваім геаграфічным становішчам — да Вільнюса бліжэй, чым да Гродна. Немалаважным фактарам для ўкладання інвестыцый стала і падтрымка беларускага ўрада, мясцовых улад.

— Увогуле, Беларусь сёння з'яўляецца прывабнай краінай для інвестараў, — перакананы Арунас Бернадзішус. — Наша кіраўніцтва лічыць, што беларускі рынак перспектыўны, эканамічная і палітычная абстаноўка ў краіне стабільныя, што дазваляе паспяхова весці свой бізнес.

## Даўгабудам тут не месца

Для рэалізацыі праекта ва ўласнасць «АРВІБЕЛАГРА» на бязвыплатнай аснове былі перададзены недабудаваныя аб'екты Лідскага мясакамбіната, якія доўгі час не выкарыстоўваліся. Пад будаўніцтва ферм для вырошчвання птушкі Гродзенскі аблвыканкам вылучыў чатыры зямельныя ўчасткі плошчай больш як 30 гектараў.

З 22 недабудаваных аб'ектаў літоўская кампанія выкарыстала пад свае патрэбы толькі 5. Знесці старыя будынкі і пабудаваць на іх месцы новыя аб'екты аказалася танней. Так за два гады на закінутым месцы вырас сучасны вытворчы комплекс. На тэрыторыі прадпрыемства таксама знаходзяцца адміністрацыйны будынак і інтэрнат для супрацоўнікаў кампаніі.

Праўда, гэты сучасны будынак менш за ўсё падобны на інтэрнат у нашым разуменні. Утульныя пакоі, абсталёваныя сучаснай мэбляй і тэхнікай, прасторная сталовая хутчэй нагадваюць гасцініцу як мінімум у тры зоркі. Пакоі ў інтэрнаце ў першую чаргу разлічаны на літоўскіх спецыялістаў, якія ў мэтах абмену вопытам будуць прыязджаць на прадпрыемства.

## Карысная і здаровая прадукцыя

Калі карэспандэнты «Звязды» наведвалі «АРВІБЕЛАГРА», вертыкальна інтэграваны комплекс быў яшчэ не поўнасцю запушчаны. Яго афіцыйнае адкрыццё адбылося літаральна днямі: птушка заняла свае месца на канвееры, а людзі заступілі на працоўныя месцы.

Фермы, дзе вырошчваюцца індыкі, запрацавалі значна раней. «Каб індыкі набралі адпаведную вагу, а мяса было добрай якасці, птушка мужчынскага полу вырошчваецца 20—22 тыдні, жаночага — 14—15, — расказала **першы намеснік дырэктара па вытворчасці Вайда СВЕТУЛЕВІЧУЦЕ.** — Корм часова набываецца на мясцовым прадпрыемстве «Лідахлебапрадукт». У перспектыве кармы будуць вырабляцца на базе комплексу».

Разам з дырэктарам кампаніі і яго намеснікам мы прайшліся па вытворчых цэхах прадпрыемства і на свае вочы ўбачылі, на якім абсталяванні і ў якіх умовах будзе ажыццяўляцца забой і разбіранне птушкі, як яе будуць упакоўваць і захоўваць. Наведалі і цэх гатовай прадукцыі: адсюль шашлык, фарш, рулеты і каўбасы з індычыны будуць пастаўляцца адразу ў крамы.

— Мяса індычкі не толькі смачнае, але і карыснае, таму ў нас ёсць усе шанцы заваяваць і беларускі рынак, і страўнікі людзей, — лічыць дырэктар кампаніі «АРВІБЕЛАГРА».

Акрамя таго, прадукцыя, створаная пад Лідай, будзе пастаўляцца ў краіны СНД, а да канца года — і ў краіны Еўрасаюза.

Неўзабаве новае прадпрыемства задаволіць гастранамічныя інтарэсы беларусаў. А для некаторых яно стане яшчэ і крыніцай даходу. Большасць працоўных месцаў зоймуць мясцовыя жыхары (а гэта прыкладна 150 чалавек толькі ў вытворчых цэхах).

*Лідскі раён.*



Першы намеснік дырэктара па вытворчасці Вайда СВЕТУЛЕВІЧУЦЕ выдатна валодае тэхналогіямі забою і разбірання птушкі, яе ўпакоўвання і захоўвання.

ПРОСТАЯ МОВА



**Ія МАЛКІНА, першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, член Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі:**

— Мясцовыя органы ўлады нясуць вялікую адказнасць за стан навакольнага асяроддзя ў рэгіёнах краіны. І спіс прыродаахоўных задач, рашэнне якіх сёння стаіць перад мясцовым самакіраваннем, вельмі аб'ёмны.

Менавіта абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія выканаўчыя камітэты выконваюць дзяржаўныя экалагічныя праграмы і іншыя прыродаахоўныя мерапрыемствы, распрацоўваюць і зацвярджаюць мясцовыя праграмы аховы прыроды. Так, напрыклад, распрацоўваюцца і зацвярджаюцца схемы абыходжання з камунальнымі адходамі, выдаткоўваюцца сродкі на барацьбу з інвазіўнымі відамі раслін, прымаюцца рашэнні аб перадачы пад ахову месцаў жыхарства дзікіх жывёл і росту раслін — відаў, уключаных у Чырвоную кнігу Беларусі. Акрамя таго, пры ўдзеле мясцовых органаў улады сёння створаны і дзейнічаюць дзяржаўныя прыродаахоўныя ўстановы, якія кіруюць асабліва ахоўваемымі прыроднымі тэрыторыямі.

Яшчэ некалькі гадоў назад тушы здохлых жывёл на сельскагаспадарчых комплексах масава захоўваліся ў жывёльных магільніках. Нягледзячы на нязначны ўплыў такіх аб'ектаў на навакольнае асяроддзе, адбывалася нерацыянальнае выкарыстанне зямельных рэсурсаў. Акрамя таго, тушы самі па сабе з'яўляюцца важным эканамічным рэсурсам — іх перапрацоўка дазваляе атрымліваць карысную прадукцыю для сельскай гаспадаркі — тэхнічны тлушч і мяса-касцявую муку.

Сёння ў Беларусі актыўна развіваецца перапрацоўка адходаў жывёлагадоўчых вытворчасцяў, у тым ліку і з удзелам прыватнага капіталу. Такія заводы сёння дзейнічаюць у Брэсцкай, Магілёўскай абласцях. І прыемна бачыць, што ў гэтай сферы працягвае працаваць і Лідскі ветэрынарна-санітарны ўтылізацыйны завод, дзе летась з прыцягненнем інвестыцый літоўскай кампаніі завяршылася рэканструкцыя. Аб'ёмы перапрацоўкі спецыялісты ацэньваюць прыкладна ў 40 тыс. тон. Гэта даволі значны ўнёсак у вырашэнне праблемы абыходжання з адходамі.

СУЧАСНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

# Без пагрозы для экалогіі

## Пад Лідай створана прадпрыемства, якое клапоціцца аб стане навакольнага асяроддзя краіны

**Лідскі ветэрынарна-санітарны ўтылізацыйны завод — другі праект, які ў раёне рэалізуецца літоўскай кампаніяй «Марыямполес АРВІ». На сучасным прадпрыемстве ажыццяўляюцца збор, утылізацыя і перапрацоўка пабочных прадуктаў жывёльнага паходжання ўсіх катэгорый, а таксама вырабляецца мяса-касцявая мука і тэхнічны жывёльны тлушч.**

Такім чынам, цяпер адходы не ўтвараюць магільнікі, як раней, а ідуць на перапрацоўку, у выніку чаго атрымліваецца запатрабаваны прадукт. Для навакольнага асяроддзя дзейнасць завода не ўяўляе ніякай пагрозы — дзякуючы новаму абсталяванню выкіды ў атмасферу мінімальныя.

— Збор адходаў жывёльнага паходжання ажыццяўляецца не толькі ад прадпрыемстваў па забоі жывёл і перапрацоўцы мяса, а і ад дзейнасці гаспадарак па вырошчванні буйной рагатай жывёлы, свіней і птушкі, — расказвае **дырэктар Лідскага ветсанутыльзавода Антон ВОЛКАЎ.** — Нашы магутнасці дазваляюць правесці ўтылізацыю адходаў жывёльнага паходжання, якія трапляюць як ад прадпрыемстваў Гродзенскай вобласці, так і з іншых рэгіёнаў Беларусі.

Якасць паслуг забяспечваецца праз аб'яднанне намаганняў экспертаў розных сфер — яны кіруюць сучаснымі тэхналогіямі, якія адпавядаюць найвышэйшым стандартам у галіне ветэрынарыі, гігіены, санітарыі, бяспекі прадуктаў харчавання і аховы навакольнага асяроддзя.

Сучасная вытворчасць, адкрытая ў 2014 годзе, дазволіла прадпрыемству выпускаць канкурэнтаздольную прадукцыю, якая адпавядае патрабаванням сусветных стандартаў, і выйсці на еўрапейскі рынак. Каштоўны бялок для розных галін прамысловасці, які выпрабляецца на Лідскім ветсанутыльзаводзе, выкарыстоўваецца для вырабу кармоў, угнаенняў, паліва, мыла і нават касметыкі. Дзякуючы сваім унікальным уласцівасцям натуральныя прадукты значна перасягаюць каштоўнасць сінтэтычных. Бялковыя прадукты, створаныя на заводзе, — біялагічная форма паўнавартасных бялкоў, мінеральных рэчываў, крыніца вітамінаў групы В.

Як расказаў дырэктар завода, па стане на 1 студзеня гэтага года аб'ём інвестыцый тут склаў 23,2 мільёна еўра. «У кастрычніку пачалася рэалізацыя праекта па павелічэнні магутнасцяў перапрацоўкі адходаў жывёльнага паходжання з 15 тысяч тон да 45 тысяч тон у год з устаноўкай варачнага катла бесперапыннага дзеяння», — адзначыў Антон Волкаў.

# Мелодыя поспеху

## Для інвестара давер да партнёра і яго прыстойнасць — даражэй за любыя эканамічныя выгады

**Пераступіўшы парог суменага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Бел-Пласт Інтэрнэшнл», што ў Лідзе, хочаш не хочаш, зазірнеш у люстэрка, што вісіць побач з галоўным уваходам. Паправіўшы прычоску або проста глянуўшы на сябе збоку, выпадкова даведваешся, што ты — лепшы работнік месяца.**


Генеральны дырэктар «Бел-Пласт Інтэрнэшнл» Анатоль ВЯЛІКІН.

Гэты звычайны запіс на люстэрку ўздымае настрой кожнаму, хто апынуўся тут па пэўных справах. А што казаць пра тых, хто сваёй штодзённай працай у цэху забяспечвае поспех і стабільнасць аднаму з вядучых прадпрыемстваў Лідчыны?

### *Заробак вышэйшы за сярэдні*

«Бел-Пласт Інтэрнэшнл» спецыялізуецца на вытворчасці пластмасавай упакоўкі для бытавой хіміі, касметыкі, лекавых сродкаў і харчовых прадуктаў. Ва ўпакоўцы, створанай лідскімі майстрамі, захоўваецца прадукцыя сусветна вядомых брэндаў: «Vanish», «Dosia», «Unicum», «Cotico», «Henkel», «Romax», «Бархім», «Камако», «ABC» і іншых.

Беларуска-польскае прадпрыемства было створана ў 1999 годзе. Укладзеныя польскім партнёрам інвестыцыі апраўдалі сябе: вытворчасць прыносіць прыбытак, рацыянальна выкарыстоўваюцца памяшканні, якія раней пуставалі, лідчане забяспечаны працоўнымі месцамі — а значыць заробкам і сацыяльным пакетам.

Невыпадкова працаваць на «Бел-Пласт Інтэрнэшнл» лічыцца прэстыжным. Не дзіва, што вакансіі тут бываюць рэдка — кожны трымаецца за сваё працоўнае месца. Стабільная заработная плата, прычым большая за сярэднюю па краіне, — тое, што ў сённяшняй эканамічнай сітуацыі найбольш патрэбна людзям.

**«Бел-Пласт Інтэрнэшнл» — не адзіны прыклад развіцця добрых адносін паміж Беларуссю і Польшчай. Толькі ў Гродзенскай вобласці створана больш як 80 беларуска-польскіх прадпрыемстваў. Увогуле па краіне — звыш 350 прыкладаў такога партнёрства.**

### *Не проста словы*

Трымацца на плаву, а тым больш працаваць з прыбыткам сёння здольнае не кожнае прадпрыемства. Нягледзячы на тое, што завод працуе ў рэжыме нон-стоп, як прызнаецца **генеральны дырэктар «Бел-Пласт Інтэрнэшнл» Анатоль ВЯЛІКІН,** іх сіла — у якасці.

І гэта не проста словы. Высокая якасць прадукцыі завода пацверджана шматлікімі ўзнагародамі. Прадпрыемства двойчы станавілася лаўрэатам прэміі ўрада Беларусі за дасягненні ў галіне якасці, прэміі СНД за дасягненні ў галіне якасці прадукцыі і паслуг. Дарэчы, за ўсю гісторыю існавання ўзнагароды прадпрыемства стала адзіным яе лаўрэатам у Гродзенскай вобласці, а таксама ў краіне (па выніках 2015 года). 13 гадоў запар прадукцыя «Бел-Пласт Інтэрнэшнл» з'яўляецца лепшым таварам Рэспублікі Беларусь, лепшым беларускім таварам на рынках Расійскай Федэрацыі. Генеральны дырэктар прадпрыемства асабіста ўзнагароджаны нагрудным знакам «Лідар якасці».

### *Памяняць работу? Няма жадання!*

Калектыў прадпрыемства даволі невялікі — 94 чалавекі. Працуюць тут у асноўным маладыя, энергічныя людзі. Сярэдні ўзрост работніка — 33 гады. Для многіх гэта адзінае працоўнае месца.

Кантралёр палімерных матэрыялаў Дана Сургіневіч аддала прадпрыемству 10 гадоў. «Калі параўнаць мой першы год работы і цяперашні перыяд, змянілася ўсё да непазнавальнасці: ад абсталявання да ўмоў працы, — расказвае жанчына. — І заробак памяняўся ў лепшы бок. Усе нашы просьбы і праблемы абмяркоўваюцца. Не дзіва, што на працу дзесяцігоддзя ў мяне ніколі не ўзнікала жадання памяняць работу».

Як расказала **намеснік генеральнага дырэктара па кадрава-прававой і ідэалагічнай рабоце Жанна ШАКУР,** высокакваліфікаванага спецыяліста прадпрыемства чакае заўсёды. «З задавальненнем забяспечваем першым працоўным месцам і маладых спецыялістаў, — гаворыць Жанна Шакур. — Моладзь прыходзіць у нас практыку, найбольш зацікаўленых мы запрашаем да сябе на работу. Рэгулярна сваю кваліфікацыю павышаюць тэхнічныя спецыялісты: для іх арганізуюцца стажыроўкі на галаўным прадпрыемстве ў Польшчы. Кожны работнік можа паўдзельнічаць у конкурсе «Чалавек года», які ладзіцца ў нас штогод. Лаўрэаты заахвочваюцца матэрыяльнымі прэміямі і ганаровымі граматамі».

Галіна Вільбік аддала прадпрыемству 14 гадоў. Па адукацыі кравец, яна прыйшла сюды па рэкамендацыі сястры і ні разу не пашкадавала. Працоўную дзейнасць пачынала ўкладчыцай-упакоўшчыцай, цяпер жанчына — загадчыца склада. Галіну задавальняе не толькі заробак, а і графік працы, сацыяльны пакет. «Грэх скардзіцца, — лічыць яна і дадае: — Тое, што прадпрыемства з'яўляецца адным з перадавых на Гродзеншчыне, — заслуга кіраўніка. Ён не проста дырэктар. Ён — сябар. Да Анатоля Леанідавіча можна звярнуцца па любым пытанні. А калі нешта здарыцца, ён і дапаможа, і падкажа. Захварэш — параіць добрага ўрача».

### *Ад выкладчыка — да бізнесмена*

Так «хварэць» за сваё прадпрыемства, а таксама за людзей, якія там працуюць, можа толькі той, хто стаяў каля яго вытокаў. Стварыўшы «Бел-Пласт Інтэрнэшнл» у 1999 годзе, Анатоль Вялікін моцна трымае штурвал свайго дзецішча.

Адчуваюць падтрымку Анатоля Вялікіна і іншыя лідчане. З'яўляючыся дэпутатам Лідскага раённага Савета, ён актыўна ўдзельнічае ў жыцці горада, заўсёды на сувязі са сваімі выбаршчыкамі, якім дапамагае ў вырашэнні надзённых праблем.

Ліда ўжо даўно стала для Анатоля Вялікіна роднай. На Гродзеншчыну брэсцкі юнак трапіў па размеркаванні пасля заканчэння Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя Луначарскага ў Мінску (цяпер Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі). Выкладаў у Лідскім дзяржаўным музычным каледжы, а неўзабаве заснаваў і свой аркестр, які пад яго дырыжыраваннем выступаў на шматлікіх пляцоўках.

Ён і сёння дырыжор. Толькі ў яго падначаленні ўжо не аркестр, а цэлае прадпрыемства, дзе ад кожнага супрацоўніка, быццам ад музычнага інструмента, залежыць, як будзе гучаць агульная мелодыя.

— У нас вельмі цёплыя адносіны з польскімі партнёрамі, аднолькавы погляд на многія рэчы, — расказвае Анатоль Вялікін, які яшчэ з'яўляецца і старшынёй Асацыяцыі польскага бізнесу ў Беларусі. — Для іх наяўнасць даверу да партнёра, яго прыстойнасць, асабістыя якасці чалавека — даражэйшыя за любыя эканамічныя выгады. Не сакрэт, што Лідскі рэгіён прывабны для інвестараў у першую чаргу сваім геаграфічным становішчам. Тэрытарыяльна мы знаходзімся за 90 кіламетраў ад Вільнюса, за 170 кіламетраў ад Мінска, за 110 кіламетраў ад Баранавіцкага чыгуначнага вузла. 130 кіламетраў — і мы ў Польшчы. Такім чынам, Ліда з'яўляецца своеасаблівым акном ва Усходнюю Еўропу і Азію. Прываблівае інвестараў і пазіцыя раённага выканаўчага камітэта, кіраўніцтва якога заўсёды ідзе ім насустрач. Увогуле Беларусь — стабільная краіна, і гэта ў Еўропе ўжо даўно зразумелі.


Кожны работнік даражыць сваім працоўным месцам.

**Над спецвыпускам працавалі: Надзея АНІСОВІЧ, Надзея БУЖАН (фота), Вераніка КАНЮТА, Сяргей НІКАНОВІЧ (фота), Вераніка ПУСТАВІТ, Рагнеда ЮРГЕЛЬ, Надзея ЮШКЕВІЧ.**

## ПРОСТАЯ МОВА


Фота БЕЛТА.

**Аляксандр ІВАНОЎСКІ, першы прарэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, член Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі:**

— Асабліваць нашай сістэмы ў тым, што побач з «вертыкаллю» выканаўчай улады практычна на кожным узроўні прысутнічаюць прадстаўнічыя органы. Гэта робіцца для таго, каб выканаўчая ўлада магла абапірацца на грамадзян, атрымліваць зваротную сувязь.

Напярэдадні чарговых выбараў органы мясцовага самакіравання думаюць пра тое, як павысіць эфектыўнасць сваёй працы. Гэта азначае — больш эфектыўна вырашаць пытанні мясцовага значэння, больш актыўна ўцягваць насельніцтва ў гэтыя працэсы. У нас адладжана сістэма для зваротаў са скаргамі, але хацелася б, каб лепш працавалі і з грамадзянскімі ініцыятывамі. Органы мясцовага самакіравання маглі б стаць той структурай, якая збірае прапановы, вызначае прыярытэты, раіцца на месцах з дэпутатамі і грамадзянамі і такім чынам выступае за канкрэтныя ідэі па развіцці тэрыторый.

Ацэньваць органы мясцовага кіравання і самакіравання можна па вычарпальным адлюстраванні меркаванняў людзей. Хацелася б, каб тыя ці іншыя групы не выпадалі з поля зроку, каб не назапашваліся супярэчнасці, каб мы маглі бачыць і іх ідэі. На што яшчэ трэба звярнуць увагу — на аб'ектыўную ацэнку дзейнасці органаў самакіравання. Гэта і ўзаемадзеянне паміж імі і адміністрацыяй на месцах, іншымі структурамі, і арганізацыя эфектыўнага планавання, методыка правядзення сходаў. Важны аспект — эфектыўнасць работы з выбаршчыкамі, рэгулярнасць сустрэч дэпутатаў з насельніцтвам. Тут можна ацэньваць наступныя паказчыкі: сярэдняя частата, час праходжання запыту ад крыніцы да адрасата, рэакцыя, формы зваротнай сувязі, меркаванне насельніцтва аб яе якасці. Наступны крытэрый — узаемадзеянне з грамадскімі арганізацыямі і аб'яднаннямі, прыцягненне іх да вырашэння пытанняў мясцовага значэння, да выхавання дзяцей і моладзі. У раёнах прыкладна 40 такіх структур, уключаючы, напрыклад, БРСМ, Белую Русь, Беларускае аб'яднанне паляўнічых і рыбаловаў. Досыць шырокі спектр арганізацый, пабудаваных амаль на валанцёрскіх пачатках.

Работа са СМІ з'яўляецца эфектыўным спосабам данясення інфармацыі. Мы правялі аналіз і атрымалася, што дэпутаты значна менш, чым кіраўнікі органаў выканаўчай улады, з'яўляюцца ў сродках масавай інфармацыі. Інфармацыйная адкрытасць забяспечваецца не толькі публікацыямі ў друкаваных выданнях, але і ў віртуальнай прасторы.


Дзяржава для народа
Мясцовае Самакіраванне
Газета выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**
Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**
**Тыраж 20.008.** **Нумар падпісаны ў 19.30 17 студзеня 2017 года.**

■ На вялікім экране

# ЧУЛЛІВАЯ «ОДА ЛЕТУЦЕННІКАМ»

## Уладальнік сямі «Залатых глобусаў» выйшаў у айчынны пракат

**Хоць у Галівуда няма манаполіі на мюзіклы, найлепшыя ўзоры жанру асацыююцца менавіта з амерыканскім кіно. «Тыя, што спяваюць пад дажджом» Джына Кэлі і з ім жа ў галоўнай ролі, «Вестсайдская гісторыя» з манхэтэнскіх падваротняў, фільмы Боба Фоса, якія ўжо сталі класікай, «Смешная дзяўчынка», «Чыкага», «Мулен руж» і нарэшце... «Ла-Ла Лэнд». Трыумфатар нядаўняй цырымоніі ўзнагароджання «Залаты глобус», якому абяцаюць яшчэ шмат перамог, упэўнена ўпісаўся ў традыцыю. Цяпер на нябёсах толькі і гавораць, што пра «Ла-Ла Лэнд» — карціна з Раянам Гослінгам і Эмай Стоўн у галоўных ролях пабіла пэўны рэкорд, калі ўзяла ўзнагароды ўсіх сямі намінацый «Залатога глобуса», на якія прэтэндавала. Нарэшце стужка выйшла ў пракат у Беларусі.**



Малады рэжысёр Дэм'ен Шазэл скокнуў вышэй галавы яшчэ ў сваім папярэднім драйвовым фільме «Апантанасць». Ён вядомы беларускай публіцы: у 2014 годзе карціна атрымала «бронзу» Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» і з поспехам прайшла ў пракаце (што незвычайна, калі нашы кінатэатры паказваюць аўтарскае кіно). Сюжэт пра маладога барабаншчыка, што не азіраючыся ідзе за сваёй прафесійнай марай і прыносіць дзеля яе ахвяры, у чымсьці пераклікаецца з «Ла-Ла Лэнд», і гэта заканамерна: ідэя мюзікла ўжо ззяла ў рэжысёры, калі на шляху да рэалізацыі задуманага ён вырашыў зняць «Апантанасць». Атрымаўся зусім не прахадны фільм, а Дэм'ен Шазэл прыцягнуў да сябе ўвагу і прымусіў сваё імя гучаць шматабяцальна. І абяцанні спраўдзіліся.

«Ла-Ла Лэнд», як сапраўдны мюзікл, разліваецца па экране простай сюжэтнай лініяй — у гэтым жанры скрозь старлеткі на шляху да славы, кахання, мары, гісторыі поспеху. Раман паміж Міяй, якая працуе афіцыянткай і марыць стаць актрысай, і Себасцьянам, што любіць джаз і хоча ўвасобіць дух сапраўднай музыкі ва ўласным клубе, вырашыў іх будучыню. І гаворка ідзе не пра сям'ю, дзяцей і загарадны дом, а пра той уклад, які пары робіць адзін у аднаго. Так, у іх абаіх, дарагой цаной, але ўсё атрымаецца. Просты, як зацяганая гісторыя Рамэа і Джульеты, сюжэт у Шазэла, дзякуючы тонкім дэталям, ненадакучлівым адсылкам (вы ўбачыце беглыя водгукі то аднаго, то іншага фільма, але «Ла-Ла Лэнд» традыцыяй не абцяжараны, а наадварот смела ўкладвае ў яе), цудоўнаму флэшбэку ва ўмоўным ладзе, выдатна разрастаецца ўшырыню.

У кранальнай гісторыі з па-свойму добрым фіналам можна і трэба смакаваць кожны эпізод, бо калі сюжэт і каштоўны ў сваёй цэльнасці, то яшчэ больш ён цікавы ў сваім натуральным цячэнні, прыгладжаных стыках паміж рэальнасцю і тэатральнасцю, у гэтым зачаравальным спалучэнні, у прыгажосці пачуццяў, якія перадаюцца ў тым ліку праз музыку Джасціна Гурвіца. Чаго вартая загалоўная песня «City Of Stars»: толькі чытай душу герояў і дадатковыя сэнсы. Гэта мова мюзіклаў, спадарства.

Галоўныя героі (Раян Гослінг і Эма Стоўн склалі выдатную пару, а тыя, хто адмовіўся ад роляў, напэўна, кусаюць локці) ды іх навакольны свет спалучылі ў сабе сучаснасць і старую школу. З аднаго боку гэта атмасфера залатой эпохі Галівуда ці, хутчэй, усяго легендарнага, што ёсць у амерыканскай культуры, а з другога боку — сучаснасць, якая на ўсім гэтым грунтуецца і ад чаго жывіцца. Себасцьян на кабрыялеце «б'юік рыўера» 1982 года, які слухае вініл, любіць класічны джаз і марыць яго зберагчы ад паведаў сучаснай поп-культуры — нібы пасланец з мінулага. І Мія, якая водзіць сучасную «таёту», у антуражы кавярні, на праслухоўваннях і вечарынках — знак нашага часу. І ўсё ж кожны з гэтых персанажаў пацвярджае сувязь часоў — старамоднасць у сучаснасці, сучаснасць, заснаваная на традыцыі. Себасцьян далучаецца да тура з папулярным гуртом, Мія жыве па класічным сцэнарыі (які культываваў Галівуд) пра дзяўчынку з маленькага горада, што марыць аб вялікім кіно.

Мара тут — цудоўны свет. Ён можа належаць кожнаму з нас, толькі майце на ўвазе: ён патрабуе мужнасці і сілы. «Ла-Ла Лэнд» вярнуў нас да той фабрыкі мрояў, якой Галівуд быў у сярэдзіне мінулага стагоддзя, і сам стаў фільмам, што ўзнавіў мару, легенду і ўвесь гэты джаз. Дэм'ен Шазэл узяў штосьці з 30-х, 50-х, 80-х гадоў мінулага стагоддзя, змясціў усё гэта ў нашы дні і нагадаў пра вялікую містыфікацыю Галівуда. Толькі «ода ўсім летуценнікам» фільм «Ла-Ла Лэнд» робіць мару не містычнай, а рэальнай. Так, рамантычная гісторыя расказвае не толькі пра каханне, а песні спяваюцца не толькі дзеля забавы.

Дзіўная карціна Дэм'ена Шазэла становіцца асалодай для ўсіх органаў пачуццяў, для непрадузятых гледачоў і для тых, хто захоча эстэцкіх шукаць. У мінскім пракаце «Ла-Ла Лэнд» будзе паказвацца да 1 лютага. Інтрыгай застаецца лёс фільма на 89-й цырымоніі ўзнагароджвання «Оскар», якая адбудзецца 26 лютага.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*

# КУРЫ ПРЫНЕСЛІ Ў ВІРКАЎ ШЧАСЦЕ

## Вясковыя забавы

З Магілёва да Віркава без асабістага транспарту проста так не дабярэшся. Паўтары гадзіны па чыгунцы, а далей хоць пешшу ідзі 20 кіламетраў. Грамадскі транспарт, на жаль, туды ходзіць рэдка. Але дзякуй клічаўскім дэпутатам: сустрэлі, давезлі і нават дачакаліся, каб падкінуць назад да станцыі. Вядома, можна было б прыпыніцца ў найбліжэйшай да чыгункі Дзмітраўцы, дзе існуе гурт «Купалачка». Менавіта ён прадэманстраваў гэты абрад для спісу культурных каштоўнасцяў. Але носьбіты жывуць менавіта ў Віркаве. Таму нават не было варыянтаў.

Маша і Паліна Вароніч, Карына Лапаціна, Аліна і Анжэла Умец — куранняткі як на падбор. Дзяўчаты апрануліся ў доўгія сукенкі з вышыўкай на падолах, павязалі стракатыя хусткі на віркаўскі манер. З хлопчыкаў кампанію ім склаў толькі Міша Васькоў. Але роля ў яго самая адказная. Ён носіць калядную зорку з іконай Божай Маці і мяшок, куды складваюцца дары ад удзячных аднавяскоўцаў. І трэба абысці дамы да заходу сонца. Такія ўмовы гэтага абраду.

Раней, кажуць, дарослыя суправаджалі дзяцей, назіралі за імі з-за кута дома. Цяпер гэтую ролю выконвае загадчыца мясцовага клуба Жанна Васькова. Але ў справы не ўмешваецца. У куранят і так усё атрымліваецца добра. Яны смела адчыняюць брамкі, грукаюцца ў вокны і дзверы: выходзьце, гаспадары, куранняткі прыйшлі. У дом заходзіць нельга, нават у такі зорны для курэй год. Дзеці гэта добра ведаюць і спяваюць на парозе. На праваКацыі зайсці не кулляюцца.

Жыхары ахвотна ўключаюцца ў гульню. «Хто такія, чаго жадаеце?» — з найграным здзіўленнем выглядвае з-за дзвярэй гаспадыня. Дзеці крычаць, што яны куры, пяюць калядныя песні, і ім трэба аддзячыць. Жанчына знікае і хутка вяртаецца з вялікім пакетам ласункаў. У Мішын мяшок сыплюцца печыва, цукеркі, іншыя прысмакі. «Дзякуй табе, гаспадыня, — кланяецца хлопец. — Каб было ў цябе і ў двары, і ў хляве, і ў доме».

Справы ідуць добра. Яшчэ толькі два дома наведалі, а ўжо вялікі пакет падарункаў назбіралі. «Дзякуй, дзеткі! Заходзьце да нас кожны год, не забывайце», — крычыць ім услед Наталля Васковіч. Яна жыве ў вёсцы з 1988 года і кожны год чакае да сябе куранятак. Кажа, што гэта да яе шчасце.

Ніна і Пётр Сякацкія паклалі ў калядны кошык аладкі і хатнюю каўбасу. Гаспадыня родам з гэтых мясцін, але 40 гадоў жыла ў Мінску. Цяпер вярнулася на радзіму. Абрад ведае з маленства, але крыху ўжо забываць стала. І вось бычцам зноў вярнулася ў дзяцінства.

Кураняты ў гэтым складзе калядуюць ужо пяты год. Кажуць, што падабаецца хадзіць, дарыць радасць людзям. «Наш візіт — гэта добры знак, будзе шанцаваць увесь год, ураджай будзе добры», — з веданнем справы кажа Міхаіл. Да народнай традыцыі дзеці адносяцца адказна. Міша, напрыклад, сам шасцікантовую звязду рабіў. І ўпрыгожыў яе абразом Казанскай Божай Маці. Але з дзяцінства непасрэднасцю лічыць яе Віркаўскай, бо верыць у тое, што яна вёску аберагае.

## Курэй змяняюць цыганы

На вёску апускаецца вечар, і дзеці бягуць па дамах. Але свята працягваецца. Ініцыятыву ў свае рукі бяруць... цыганы.

— Адбіліся некалькі цыганоў ад табара і засталіся ў вёсцы, пазнаёміліся з паннай і панічам, потым да іх далучыліся нявеста з жаніхом — і пайшлі хадзіць па хатах, — знаёміць з паходжаннем абраду Жанна Васькова. Яна ж па сумяшчальніцтве цыганка. Абрад, у адрозненне ад Курэй, пакуль яшчэ не набыў статусу нематэрыяльнай каштоўнасці. Але тут рыхтуюцца да справаздачы.

Удзельнікі вопытныя, калядуюць ужо трэці год. Адзенне падбіралі па апісаннях старых людзей. Бізун, напрыклад, абавязковы атрыбут цыгана. А ў механошы павінен быць свісток. А яшчэ трэба мець звон на палачцы. Каб было здаля чуваць, што цыганы ідуць.

Стракатай кампаніяй рушым па вуліцы. Грукаемся ў хату: «Дазвольце цыганам пагрэцца. Раз у год бываем, нікому не дакучаем». І гаспадары дазваляюць, запрашаюць у пакой да навагодняй ёлкі. Госці спяваюць калядныя песні, потым прапануюць паваражыць. Цыганка бярэ гаспадыню за далонь і, хто б сумняваўся, просіць спачатку «пакласці на ручку грошай кучку». За шчодрасць абяцае шчаслівае жыццё і багацце на цэлы год. Потым дастае з кішэні саломінкі і прапануе цягнуць. Калі пападзецца доўгая і тоўстая, то ўраджай будзе добры і багаты. «Каб была пшаніца, як прыгожая дзяўчына, каб капуста ўрадзіла ўсім на дзіва, каб вяліся свінні, цялушкі і розныя птушкі, каб хата была заўсёды багатая. Жадаем шчасця, здароўя і долі, а гора нікол!», — калядоўшчыкі наперабой так і сыплюць пажаданнямі. Гаспадыня задаволена, запрашае прыйсці на наступны год.



Пачастункі для цыганоў.

«Як пачастуеце, так і прыйдзем», — абяцаюць бойкія на язык госці. Жанчына ідзе па прысмакі і хутка вяртаецца з блінамі, яблыкамі, салам і хлебам. «Дзякуй за падарункі, а мы пойдзем далей калядаваць, добрых людзей са святам віншаваць», — развітваюцца цыгане.

У наступным доме калядоўшчыкам аддзячылі сасіскамі. «Сваёй каўбасы, на жаль, няма, толькі гарадская, — апраўдваўся гаспадар, працягваючы падарунак. — Мы з жонкай хоць і нарадзіліся ў Віркаве, але ўсё жыццё пражылі ў Мінску. Вось крыху і забыліся традыцыі, але наступным разам абавязкова падрыхтуемся».

— У нас тут весела, — кажа Жанна Васькова па дарозе да наступнай хаты. — На Вялікдзень валачобныя песні спяваем. На Купалу збіраемся. Людзі тут так заўсёды жылі.



Нявеста з жаніхом выглядаюць натуральна.

Віркаў — вёска хоць і маланаселеная, але па памерах вялікая, дамы або цiснуцца адзін да аднаго, або стаяць на вялікай адлегласці. Раней, кажуць, месца вольнага не было. За апошні час шмат дамоў зніклі. Але народныя паданні не забываюць. Напрыклад, той ручай, што трапіўся нам па дарозе, калісьці быў вялікай ракой. Але пасля таго, як тут патануў 7-гадовы хлопчык, маці пракляла рэчку, і яна змялела. Адзін вядзьмар прапанаваў вярнуць ёй былую моц, але патрабаваў у водкуп сямігадовых каня, пеўня і хлопчыка. Каня і пеўня знайшлі, а вось хлопчыкам ахвяраваць не сталі. Так і засталася рэчка ручаём. За ім якраз жывуць Галіна і Васіль Умец. Для калядоўшчыкаў яны нават багаты стол накрылі.

— Калядую-калядую, каўбасу чую, — смяюцца калядоўшчыкі і ахвотна прымаюць запрашэнне. Катлеты, бульба, квашаная капуста, хатнія разнасолы — нічога смачнейшага за гэтыя простыя вясковыя стравы, здаецца, у жыцці не існуе.

Усё ж такі весела жылі нашы продкі. Ехала дадому, а ў вушах усё яшчэ гучала. «Мы прыпеўкі на калядкі развясёлыя пяём. Вы нас добра пачастуйце, бо пакрыўдзімся, пайдзём». «І сёння Куцця, і заўтра Куцця, завітайце на Калядкі, пагуляем хаця». «Сеем, веем, развіваем, дабрабыту ўсім жадаем, вы гатуйце нам бліны, каб прыгожа пелі мы». «Каляда, Каляда, хай абходзіць вас бяда. І няхай на ваш парог прыйдзе радасць у Новы год».

Дарэчы, абодва абрады — «Куры» і «Цыганы» — на Клічаўшчыне адрадзіліся дзякуючы неабыякаваму да народных традыцый чалавеку Жанне Ачыновіч. Менавіта яна паклапацілася, каб занатаваць абрадавыя песні, якія яшчэ ведаюць мясцовыя бабулькі. Цяпер яны ў агульнай скарбніцы нашай краіны.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*



Пажадалі ўнукаў на шчасце.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

белагропромбанк
традиции будущего

## ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК» с 20 февраля 2017 года

Вклады (депозиты) с плавающими процентными ставками

% годовых

| Сумма депозита, ед. валюты | Срок, дни | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 100 | 200 | 300 | 500 | 1 000 | 2 000 | 3 000 |
| **Белорусские рубли *** | | | | | | | |
| 1 – 100 | 19,0 | 19,0 | 19,0 | 19,0 | 19,0 | 19,0 | 19,0 |
| 101 – 1 000 | 19,0 | 19,0 | 19,0 | 19,0 | 19,0 | 19,0 | 19,0 |
| 1 001 и более | 19,0 | 19,0 | 19,0 | 19,0 | 19,0 | 19,0 | 19,0 |
| **Доллары США, евро *** | | | | | | | |
| 1 – 500 | 4,00 | 4,00 | 4,00 | 4,00 | 4,50 | 4,50 | 4,50 |
| 501 – 5 000 | 4,00 | 4,00 | 4,00 | 4,00 | 4,50 | 4,50 | 4,50 |
| 5 001 и более | 4,00 | 4,00 | 4,00 | 4,00 | 4,50 | 4,50 | 4,50 |
| **Российские рубли *** | | | | | | | |
| 1 – 15 000 | 6,30 | 6,60 | 6,90 | 7,10 | 7,60 | 7,90 | 8,20 |
| 15 001 – 150 000 | 6,40 | 6,70 | 6,95 | 7,20 | 7,70 | 7,95 | 8,30 |
| 150 001 и более | 6,50 | 6,80 | 7,00 | 7,50 | 7,80 | 8,00 | 8,50 |
| **Белорусские рубли **** | | | | | | | |
| 1 – 100 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 |
| 101 – 1 000 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 |
| 1 001 и более | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 |
| **Доллары США, евро, российские рубли **** | | | | | | | |
| 1 – 500 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 |
| 501 – 5 000 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 |
| 5 001 и более | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 |

Настоящие ставки применяются:
* для договоров срочного банковского вклада (депозита) с плавающими процентными ставками, заключенных до 01.09.2013, за исключением случаев автоматического увеличения срока их хранения в соответствии с пунктом 3.6 Условий срочного банковского вклада (депозита) ОАО «Белагропромбанк» (с плавающей процентной ставкой), утвержденных решением Кредитного комитета ОАО «Белагропромбанк» от 16.02.2006, протокол № 21 (далее – Условия);
** для договоров срочного банковского вклада (депозита) с плавающими процентными ставками, заключенных до 01.09.2013, в случаях автоматического увеличения с 01.04.2016 срока их хранения в соответствии с пунктом 3.6 Условий.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

Время работы Контакт-Центра Банка: 8.00 - 20.00 - рабочие дни; 8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) - по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

## ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) «СИСТЕМА СБЕРЕЖЕНИЙ ЛИНИЯ РОСТА 2.0» с 20 февраля 2017 года

% годовых

| Сумма депозита, ед. валюты | Сроки | | | |
|---|---|---|---|---|
| | до 6 месяцев<br>90 – 180 дней | от 6 месяцев до 1 года<br>181 – 370 дней | от 1 года до 2 лет<br>371 – 740 дней | от 2 до 5 лет<br>741 – 2000 дней |
| **Для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в белорусских рублях, заключенных до 01.04.2016 года *** | | | | |
